Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
24 СНЕЖНЯ 2019 г.
АЎТОРАК
№ 244 (29111)

## З павагай да вечных каштоўнасцяў

*Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Нараджэнне Хрыстова 25 снежня*

Дарагія суайчыннікі!

Ад усёй душы віншую вас з Нараджэннем Хрыстовым.

Больш за дваццаць стагоддзяў Віфлеемская зорка асвятляе нам шлях дабра і надзеі. Хрысціянства змяніла гісторыю і культуру ўсяго чалавецтва, аказала вялізны ўплыў на фарміраванне духоўных арыенціраў — сацыяльнай справядлівасці, узаемнай падтрымкі і міласэрнасці.

Абапіраючыся на традыцыйныя маральныя каштоўнасці, разам з верай мы перадаём нашчадкам самае галоўнае: любоў да роднай зямлі, мудрасць і вопыт папярэдніх пакаленняў, што дапамагае будаваць будучыню на прынцыпах міру, павагі і добрасуседства, такіх запатрабаваных на сучасным этапе развіцця грамадства.

У гэты радасны дзень жадаю здароўя, шчасця і поспехаў ва ўсіх добрых пачынаннях.

Няхай гэтае светлае свята напоўніць вашы дамы цяплом узаемаразумення і дабрабытам.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# ШЧАСЦЕ ВЕРЫЦЬ У ЦУД



Таццяна МАЗЬКО з дочкамі Ксеніяй і Палінай і дзесяцімесячным сынам Станіславам (ён у калясцы, гэта яго першае Раство) упрыгожваюць калядную ёлку каля фасада касцёла Яна Хрысціцеля ў сталічным мікраёне Серабранка.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ХРЫСТУС НАРАДЗІЎСЯ, НЕ БОЙЦЕСЯ ПРЫНЯЦЬ ЯГО!

## Пастырскае пасланне архіепіскапа Тадэвуша Кандрусевіча на Божае Нараджэнне 2019 года

Дарагія браты і сёстры, суайчыннікі!

«Хрыстус нарадзіўся, Бог аб'явіўся».

Гэтымі словамі мы абвяшчаем радасць свята Божага Нараджэння, якое найперш павінна насіць духоўны характар, бо Бог у вобразе чалавека ўвайшоў у наша жыццё.

Аднак у апошнія часы ўсё часцей праяўляецца тэндэнцыя вонкавай падрыхтоўкі да яго і святкавання паводле воклічу старажытных рымлян: «Хлеба і відовішчаў». Вірус спажывальніцтва і задавальненняў разбурае наша маральнае жыццё і хрысціянскія традыцыі. Мы не дазваляем Езусу сваёй ласкай нарадзіцца ў нашых душах, і Ён не прысутнічае ў нашым жыцці.

У той жа час Бог прапануе значна большую перспектыву, чым супермаркет, матэрыяльныя каштоўнасці ці задавальненні. А менавіта — вечнасць, да якой нас вядзе Езус, чыё нараджэнне святкуем.

Нягледзячы на працэсы секулярызацыі, чалавецтва адзначае свята Божага Нараджэння. Сведчаць пра гэта летазлічэнне, якое бярэ свой пачатак ад нараджэння Езуса, папулярныя калядныя канікулы і канцэрты, практыка святочных віншаванняў і да т. п.



Фота БелТА.

Евангельскі аповед пра нараджэнне Хрыста ўжо дваццаць стагоддзяў зачароўвае сэрцы людзей. Яслі з Немаўляткам Езусам, Марыяй, Юзафам і хатнімі жывёламі; пастушкі, анёльскія хоры і бэтлеемская зорка. Гэта ўсё так прыгожа і так захапляе, што мы становімся падобныя да дзяцей. Таму з радасцю паўтараем словы Евангелля: «Нарадзіўся сёння ў горадзе Давіда Збаўца, якім ёсць Хрыстус Пан».

Езус збавіў нас ад граху. Але ці на гэтым Яго заданне завяршылася? У наш час шматлікіх крызісаў мы ўсё больш пераконваемся, што без Божага ўмяшання не зможам вырашыць нашых праблем.

А іх шмат. Найперш гэта крызіс сям'і, якая з'яўляецца падмуркам грамадства. Большасць сем'яў знаходзіцца ў разводзе. Таму падмурак нашага грамадства нетрывалы, што не абяцае яму добрай будучыні, бо дзеці застаюцца без належнай апекі і выхавання абодвух бацькоў. Хто іх выхоўвае? Не сям'я, а вуліца і сродкі масавай камунікацыі. У выніку дзеці ізалююцца і становяцца залежныя ад сучасных тэхналогій і амаральных звычак.

Завоблачныя лічбы падае статыстыка абортаў. Мы павінны шанаваць жывёл і добра ставіцца да іх. Але ці не здзіўляе нас тое, што за забойства сабакі нас могуць пакараць, а забойства дзіцяці ва ўлонні маці дазволена? Сям'я, якая павінна быць «санктуарыем жыцця», ператвараецца ў месца самагенацыду нацыі.

СТАР. 2

# Адзін суд — адна інстанцыя

## Валянцін Сукала далажыў Прэзідэнту пра вынікі работы сістэмы правасуддзя за гэты год

**Сёлета ў красавіку адкрылі велічны будынак Дома правасуддзя. Чырвоную стужку перарэзаў Прэзідэнт краіны, але гэта не адзіная нагода, дзеля якой ён сустрэўся з прадстаўнікамі судовай улады Беларусі. У той жа дзень прайшла вялікая канцэптуальная размова, дзе вызначалі галоўныя пастулаты для ўдасканалення ўсёй сістэмы правасуддзя. Гаварылі аб прафесійных якасцях кадраў, Інстытуце перападрыхтоўкі суддзяў, навучанне ў якім трэба кардынальна перабудаваць, распрацоўцы адзінага Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса, выкарыстанні медыяцыі і трацейскіх судоў, лічбавізацыі ўсёй сістэмы судоў — ад Вярхоўнага да раённых.**

«Цікавае было мерапрыемства. І там мы дамовіліся па рэалізацыі шэрага прапаноў нашых суддзяў, судовага корпуса. Гэтыя прапановы маюць пэўны сэнс і пэўныя тэрміны рэалізацыі. Як тут абстаяць справы? Ну і традыцыйна яшчэ адно пытанне — крымінальныя справы, работа Следчага камітэта па гэтых справах і судоў, па справах, якія кантралююцца не толькі Прэзідэнтам, але і ў вас на кантролі, якія набылі грамадскае гучанне. Як рэалізуюцца гэтыя справы?» — акрэсліў тэмы размовы Прэзідэнт.

Валянцін Сукала расказаў, што 5 красавіка была фактычна сфарміравана праграма нацыянальнага развіцця сістэмы правасуддзя на найбліжэйшыя пяць гадоў. Туды ўключаны 23 палажэнні, 14 з іх датычацца непасрэдна Вярхоўнага Суда. «Выкананне часткі з іх надыходзіць сёлета, таму я хацеў бы коратка далажыць, што мы зрабілі ў гэтым годзе і што нам трэба зрабіць у больш далёкі перыяд», — далажыў старшыня Вярхоўнага Суда Беларусі.

*Пра тое, што зрабілі ўжо сёлета, Валянцін Сукала пасля сустрэчы з Прэзідэнтам падрабязна расказаў журналістам.*

• Лічбавізацыя. У першым чытанні прыняты закон аб далейшым павелічэнні адкрытасці судовых працэсаў у выглядзе іх фіксацыі з выкарыстаннем лічбавых тэхналогій. Практыка пастаяннай відэа- і аўдыяфіксацыі судовых працэсаў пачнецца з 1 студзеня ва ўсіх абласных судах, а пасля выйдзе на ўзровень раённых судоў. «Мы ўжо апрабавалі гэта на судовых працэсах у самім Вярхоўным Судзе і ўпэўніліся, што гэта вельмі важная і прынцыповая пазіцыя, якая робіць наша правасуддзе больш адкрытым і празрыстым, зніжае канфліктнасць, ліквідуе заўвагі на пратаколы судовага пасяджэння, дысцыплінуе ўдзельнікаў працэсу», — адзначыў старшыня Вярхоўнага Суда.

• Фарміраванне банка даных судовых рашэнняў. Цяпер усе найбольш важныя і актуальныя судовыя рашэнні будуць захоўвацца ў спецыяльным банку даных у адкрытым доступе. Усе ахвотныя змогуць з імі азнаёміцца.

• Абмежаванне судовай юрысдыкцыі па бясспрэчных справах. Частку такіх спраў перададуць у юрысдыкцыі выканаўчых надпісаў. «Судам у гэтым плане знізяць нагрузку, і яны атрымаюць магчымасць сканцэнтравацца на больш важных і актуальных, праблемных справах», — растлумачыў Валянцін Сукала.

• Пераразмеркаванне штатнай колькасці. Адбываецца гэты працэс унутры судовай сістэмы без павелічэння штату суддзяў. Нагрузку ў частцы судоў аптымізавалі, а свабодныя кадры пераводзяць у суды, дзе ёсць недахоп спецыялістаў.

• Новыя патрабаванні да кадраў. З новага года ўводзіцца абавязковае псіхалагічнае тэсціраванне для кандыдатаў на пасаду суддзі. Праграма, на думку старшыні Вярхоўнага Суда, дазволіць абіраць юрыстаў, якія змогуць працаваць у экстрэмальных, канфліктных сітуацыях.

• Амністыя. Кіраўніком дзяржавы было прынята рашэнне аб падрыхтоўцы адпаведнага спецыяльнага закона да святкавання 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэтае заданне Вярхоўны Суд выконвае разам з Міністэрствам унутраных спраў. «Я думаю, ён па сваім аб'ёме будзе на ўзроўні таго закона, які ўжо прымаўся сёлета», — удакладніў Валянцін Сукала.

У Беларусі ствараецца адзіны эканамічны апеляцыйны суд. Сёння эканамічныя абласныя апеляцыйныя суды разглядаюць спрэчкі па першай інстанцыі, і яны ж разглядаюць іх у апеляцыйным парадку. Гэтую функцыю цяпер забіраюць з абласных судоў і перадаюць у спецыяльны адзіны на ўсю краіну суд.

Па словах старшыні Вярхоўнага Суда, гэта павысіць якасць разгляду эканамічных спрэчак, дазволіць завяршаць правасуддзе на апеляцыйнай стадыі.

«Мы тых суддзяў, якія разглядаюць справы ў апеляцыйным парадку сёння ў абласных эканамічных судах, забіраем і пераводзім у Мінск, дзе фарміруем такі адзіны суд. На практыцы атрымліваецца, што прыкладна 75 % апеляцыйных скаргаў разглядаецца на рашэнні гарадскога і абласнога эканамічных судоў. То-бок асноўныя эканамічныя спрэчкі тут у горадзе Мінску і Мінскай вобласці», — адзначыў Валянцін Сукала.

Працаваць у новай судовай структуры будзе больш за 20 суддзяў. Па словах старшыні Вярхоўнага Суда, павінна рэалізоўвацца правіла «адзін суд — адна інстанцыя». Калі ў адным судзе існуюць дзве інстанцыі, гэта можа адбівацца на якасці правасуддзя. Як запэўніў Валянцін Сукала, суд будзе працаваць пераважна ў рэжыме відэаканферэнцсувязі, каб не запрашаць бакі ў Мінск. Рэалізавана прапанова будзе за кошт уласных сродкаў Вярхоўнага Суда.

У будучыні магчымасці апеляцыйных судоў пашыраць не толькі ў эканамічных, але і ў агульных судах пры адначасовым скарачэнні судовага нагляду.

Вярхоўны Суд быў адным з ініцыятараў скарачэння складаў адміністрацыйных парушэнняў. «Больш за 70 органаў і службовых асоб мае права на складанне такіх пратаколаў, і, зразумела, там не ўсе людзі маюць вышэйшую юрыдычную адукацыю», — растлумачыў Валянцін Сукала нізкую якасць складзеных адміністрацыйных пратаколаў. На яго думку, пэўныя нязначныя правапарушэнні не павінны распаўсюджвацца на доўгі перыяд і адбівацца на біяграфіях грамадзян.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Германія ўпэўненая ў завяршэнні будаўніцтва «Паўночнага патоку—2»




Улады Германіі выказалі ўпэўненасць у тым, што праект «Паўночны паток—2» будзе завершаны, паведамляе Sueddeutsche Zeitung са спасылкай на крыніцы ў кабінеце міністраў ФРГ. Адзначаецца, што пазіцыя ўрада ў адносінах да гэтага праекта не змянілася. Акрамя таго, улады Германіі лічаць, што ўведзеныя супраць расійскага газапровода санкцыі ЗША не перашкодзяць завяршэнню яго будаўніцтва. Раней віцэ-канцлер і міністр фінансаў Германіі Олаф Шольц заявіў, што Берлін катэгарычна супраць санкцый ЗША ў дачыненні да кампаній, якія пракладваюць газаправод «Паўночны паток—2». Палітык назваў іх сур'ёзным умяшаннем ва ўнутраныя справы Германіі і Еўропы.

Санкцыі супраць расійскіх газаправодаў «Паўночны паток—2» і «Турэцкі паток» былі ўключаны ў амерыканскі абаронны бюджэт на 2020 фінансавы год, які падпісаў прэзідэнт ЗША Дональд Трамп. Пасля гэтага швейцарская кампанія Allseas прыпыніла будаўніцтва «Паўночнага патоку—2».

## Google аштрафавалі на 150 мільёнаў еўра

Французскае ўпраўленне па канкурэнцыі аштрафавала кампанію Google на 150 мільёнаў еўра, паведамляе The Local. Арганізацыя абавязала Google растлумачыць правілы рэкламнай платформы Google Ads і метады адключэння ўліковых запісаў рэкламадаўцаў. У кампаніі ёсць два месяцы на падрыхтоўку дэталёвага апісання мер і працэдур, якія яна мае намер укараніць, каб прывесці сваю дзейнасць у адпаведнасць з патрабаваннямі французскага заканадаўства. Кіраўнік упраўлення Ізабель дэ Сільва заявіла, што Google кантралюе ад 90 да 100 працэнтаў рынку пошукавай рэкламы ў Францыі і злоўжывае сваім манапольным становішчам. «З вялікай сілай прыходзіць і вялікая адказнасць», — працытавала яна героя фільма «Чалавек-павук».

## Інтэлекту чалавецтва прадказана зніжэнне



Навукоўцы Універсітэта Каларада ў Боўлдэры (ЗША) даказалі, што павышанае ўтрыманне вуглякіслага газу ў атмасферы можа катастрафічна паўплываць на інтэлектуальныя здольнасці людзей, паведамляе Phys.org.

Даследчыкі разгледзелі, як павелічэнне ўзроўню дыяксіду вугляроду ўплывае на навучальнасць дзяцей. Папярэднія эксперыменты паказалі, што высокая канцэнтрацыя газу сапраўды ўздзейнічае на разумовыя здольнасці, аднак праблему лёгка вырашыць, калі праветрыць памяшканне. У той жа час быў невядомы эфект, які аказвае свежае паветра з вялікай колькасцю вуглякіслага газу. Спецыялісты разгледзелі два сцэнарыі. У першым чалавецтва памяншае колькасць выкіданага ў атмасферу парніковага газу, у другім выкіды застаюцца на ранейшым узроўні. Высветлілася, што кагнітыўныя здольнасці навучэнцаў зніжаюцца ў любым выпадку. Згодна з прадказаннямі навукоўцаў, у лепшым варыянце падзенне інтэлекту да 2100 года складзе 25 працэнтаў, а ў горшым — 50.

ISSN 1990 - 763X
19244>
9 771990 763008

## КОРАТКА

• Мінтранс вывучае магчымасць адкрыцця ў 2020 годзе рэйсаў паміж рэгіянальнымі аэрапортамі.

• **Больш за 40 крыніц Віцебскай вобласці з'явілася на публічнай кадастравай карце.**

• Забег Дзядоў Марозаў і лазернае шоу пройдуць у Магілёве 25 снежня.

• **У Брэсцкай вобласці ад незвычайна цёплага надвор'я ў снежні заквітнела ветрагонка.**




Спецыяльны рэпартаж

# «УЗЫШЛА Ў ЛЕСЕ ЁЛАЧКА...»

## Як выбраць галоўны сімвал Новага года

**Жывая ці штучная — якая ёлка будзе радаваць вас падчас свят? Яшчэ не вызначыліся? Паспяшайцеся! Калі што, з 20 снежня ў Беларусі запрацавалі ёлачныя базары, дзе навагоднюю прыгажуню можна набыць ад 10 рублёў. «Звязда» пабывала ў Маладзечанскім лясгасе і даведалася, як правільна выбраць ёлку, што рабіць, каб з яе не асыпаліся ўсе іголкі і чаму спецыялісты раяць купляць дрэва ў кадцы.**

СТАР. 3




**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2020 года, — у падарунак 4 календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы**

# АД АФРЫКАНСКАГА ВЕКТАРА ДА ВЕНСКАГА БАЛЮ

## Вынікі дзейнасці Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта сёлета лепшыя за леташнія

**Выручка ад рэалізацыі прадукцыі складзе больш за 1,8 мільярда беларускіх рублёў , абарот знешняга гандлю таварамі і паслугамі — больш за 300 мільёнаў долараў ЗША. У тры разы скарочана колькасць стратных прадпрыемстваў.**

Аб папярэдніх выніках года ў рабоце арганізацый і прадпрыемстваў, падпарадкаваных Кіраўніцтву спраў, Аляксандру Лукашэнку далажыў **Віктар ШЭЙМАН.**

Сярод абмеркаваных на сустрэчы тэм — запуск серыйнай вытворчасці пластыкавых лыж, афрыканскі вектар супрацоўніцтва, які курыруе кіраўнік спраў Прэзідэнта, кадравыя пытанні ў сістэме.

Аляксандр Лукашэнка асобна адзначыў напружаную работу Кіраўніцтва спраў у перыяд навагодніх свят. «Попыт у гэты час, калі можна так сказаць, на Прэзідэнта вельмі вялікі. Але гэта прыемныя клопаты, хоць і фізічна гэта нагрузка вялікая, — сказаў ён. — Кіраўніцтва спраў мусіць гэта ўсё забяспечваць, на вас кладзецца вялікая нагрузка».

У шэрагу такіх прыемных клопатаў, напрыклад, дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» і Венскі баль, якія адбудзецца 28 снежня ў Палацы Незалежнасці.

**Паводле БелТА.**

Сацыяльны вектар

# КАМУ МОГУЦЬ ПАВЯЛІЧЫЦЬ ДАПАМОГУ ПА БЕСПРАЦОЎІ

**Міністэрства працы і сацыяльнай абароны выступае з ініцыятывай падняць памер дапамогі па беспрацоўі. Міністр Ірына КАСЦЕВІЧ у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» расказала, хто зможа разлічваць на павышаную дапамогу ў першую чаргу.**

У прыватнасці, Ірына Касцевіч адзначыла, што цяперашнім часам ведамства рыхтуе праект закона аб унясенні змяненняў у закон аб занятасці. «Мы выходзім з ініцыятывай павялічыць дапамогі, у прыватнасці беспрацоўным з тэрыторый з напружанай сітуацыяй на рынку працы. Другая катэгорыя — гэта людзі ва ўзросце 50+, якім сапраўды складана канкурыраваць», — сказала міністр. Яна дадала, што людзі ва ўзросце старэй за 50 гадоў у сярэднім шукаюць работу адзінаццаць месяцаў. Гэта дастаткова вялікі тэрмін, лічыць міністр, таму трэба гэтых людзей фінансава падтрымаць. Пры гэтым сітуацыю на рынку працы ў краіне Ірына Касцевіч лічыць досыць стабільнай.

**По метадалогіі Міжнароднай арганізацыі працы ўзровень беспрацоўя ў нашай краіне складае 3,9 %. Узровень занятасці сярод асоб працаздольнага ўзросту складае амаль 84 %.**

**Святлана БУСЬКО.**

Наш бюджэт

# Што зменіцца пры налічэнні заробкаў педагогам?

**Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з 1 студзеня 2020 года змяняецца парадак фарміравання заработнай платы работнікаў бюджэтных арганізацый. Яна будзе разлічвацца зыходзячы з базавай стаўкі (замест тарыфнай стаўкі першага разраду) і 18-разраднай тарыфнай сеткі (замест 27-разраднай).**

У Міністэрстве адукацыі растлумачылі, што ў заробку педагагічных работнікаў асобныя выплаты будуць аб'яднаныя і зменены.

У прыватнасці, у гэтым годзе заработная плата выхавальніка і настаўніка складалася з тарыфнага акладу, павышэнняў тарыфнага акладу, устаноўленых пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, павышэння тарыфнага акладу за працу па кантракце; павышэння тарыфнага акладу за стаж работы па спецыяльнасці, надбаўкі за наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі, надбаўкі за выкананне асобных відаў работ, надбаўкі за высокія прафесійныя, творчыя, вытворчыя дасягненні ў працы, яе складанасць і напружанасць, а таксама за выкананне асабліва важных (тэрміновых) работ, прэміі і матэрыяльнай дапамогі.

З 1 студзеня 2020 года заработная плата выхавальнікаў і настаўнікаў будзе складацца з акладу, надбавак: за стаж работы ў бюджэтнай арганізацыі, за работу па кантракце, за спецыфіку працы ў сферы адукацыі ў залежнасці ад кваліфікацыйнай катэгорыі, за характар працы пры выкананні асобных відаў работ, за высокія дасягненні ў працы і прэміі.

Заработная плата дацэнта, які мае вучоную ступень кандыдата навук, складаецца цяпер з тарыфнага акладу, павышэння тарыфнага акладу ў адпаведнасці з пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, павышэння тарыфнага акладу за працу па кантракце, павышэння тарыфнага акладу за стаж работы па спецыяльнасці, даплаты за вучоную ступень кандыдата навук, надбаўкі за выкананне асобных відаў работ (за куратарства вучэбнай групы і іншае), надбаўкі за высокія прафесійныя, творчыя, вытворчыя дасягненні, складанасць і напружанасць працы, а таксама за выкананне асабліва важных (тэрміновых) работ, прэміі і матэрыяльнай дапамогі.

З 1 студзеня 2020 года заработная плата дацэнта, які мае вучоную ступень кандыдата навук, будзе складацца з акладу, надбавак за працу па кантракце, за стаж работы ў бюджэтных арганізацыях, за навуковую ступень кандыдата навук, за спецыфіку работы ў сферы адукацыі, за характар працы пры выкананні асобных відаў работ, за высокія дасягненні ў працы і прэміі.

Акрамя таго, з 2020 года работнікам бюджэтных арганізацый будзе ажыццяўляцца штогадовая аднаразовая выплата на аздараўленне з разліку 0,5 акладу (як правіла, пры сыходзе ў адпачынак), а таксама аказвацца матэрыяльная дапамога (як правіла, у сувязі з неспадзяванымі матэрыяльнымі цяжкасцямі).

Такім чынам, з 2020 года зменены віды і памеры выплат, з якіх складаецца заработная плата, пры гэтым памер заработнай платы кожнага работніка не знізіцца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Грошы

# Брэсцкая крэпасць, Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку і Траецкае прадмесце

**Учора Нацыянальны банк выпусціў у абарачэнне памятныя манеты серыі «Архітэктура Беларусі».**

Як паведамляюць спецыялісты прэс-службы Нацбанка, архітэктурную серыю працягнуць манеты «Брэсцкая крэпасць», «Палацава-паркавы ансамбль. Жылічы», «Свята-Раства-Багародзіцкая царква. Мураванка», «Петрапаўлаўскі сабор. Гомель», «Спаса-Праабражэнская царква. Полацк», «Траецкае прадмесце. Мінск».

Гэтыя манеты былі выпушчаныя наміналам 2 рублі тыражом 25 тысяч штук кожнага наймення. Матэрыял — сталь, пакрытая меддзю і латунню (кольца), і сталь, пакрытая меддзю і нікелем (сярэдзіна). Манеты адчаканены на Манетным двары Польшчы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ХРЫСТУС НАРАДЗІЎСЯ, НЕ БОЙЦЕСЯ ПРЫНЯЦЬ ЯГО!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Амаральная сексуальная адукацыя ўсімі праўдамі і няпраўдамі прасоўваецца ў навучальныя ўстановы і грамадства. Адкідваецца традыцыйная мадэль сям'і, і прапагандуюцца аднаполыя саюзы.

Такая і падобная практыка сучаснага жыцця вядзе ў бездань. А свет без Бога з'яўляецца светам згубленага чалавецтва, як кажа Папа Бенедыкт XVI. Таму мы павінны сказаць нашае рашучае «не» антыхрысціянскім тэндэнцыям!

У ноч Божага Нараджэння анёл сказаў пастушкам: «Не бойцеся!». Гэтыя словы адрасаваны таксама і людзям нашага часу, як дваццаць стагоддзяў таму яны былі скіраваны да пастушкоў. Мы атрымалі Збаўцу, які не пакідае нас адных і заўсёды бароніць. Гэта самая вялікая радасць і адзінае вырашэнне ўсіх нашых праблем.

Езус кажа: «Я з вамі ва ўсе дні, аж да сканчэння веку». А калі Ён з намі, то і мы павінны быць з Ім, бо ў Яго былі ўключаны ў сакраманце хросту. Калі Бог з намі, то хто супраць нас?

У сучасным свеце абарона праўды і барацьба за хрысціянскія каштоўнасці патрабуюць надзвычайнага гераізму. Дзякуй Богу, у нас скончыўся час ганенняў на веру. Аднак настае час ганенняў «у белых пальчатках». Дэмакратычным спосабам прымаюцца нязгодныя з Божым правам законы, вера спіхваецца на перыферыю жыцця і высмейваецца, адбываюцца акты блюзнерства, прафанацыі і знішчэння рэлігійных сімвалаў. Чыніцца ўсё гэта найчасцей на падставе правоў чалавека на абсалютную свабоду і талерантнасць без маральнай адказнасці.

Цыцэрон казаў, што вяршыня закону з'яўляецца вяршыняй беззаконня. Таму самая вялікая талерантнасць становіцца вяршыняй неталерантнасці. Разбураецца ўстаноўлены Богам маральны парадак. Прапагандаваць амаральныя справы становіцца нормай, а маральныя — праблемай. У выніку настае сістэматычная маральная дэградацыя чалавека, сям'і і цэлых народаў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Касцёл атрымаў ад Езуса місію абвяшчэння Евангелля ўсяму чалавецтву, і ніхто, таксама і людзі нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі, не можа быць пазбаўлены магчымасці пачуць Добрую Навіну. Аднак у імя вернасці сваёй місіі Касцёл павінен абвяшчаць поўнае Евангелле — не выключаючы яго патрабаванняў. Павага да асоб нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі не можа весці да прыняцця ідэалогій, якія імкнуцца перавярнуць традыцыйныя хрысціянскія звычаі з ног на галаву і ўчыніць рэвалюцыю ў галіне маральнасці, што вядзе да духоўнага спустошэння, кажа папа Францішак.

У наш час супрацьстаяння Божай праўды з неаязычніцтвам мы становімся перад неабходнасцю радыкальнага этычна-рэлігійнага выбару: захаваць вернасць вучэнню Хрыста ці ігнараваць яго.

Праз служэнне Касцёла Хрыстус прыходзіць да нас, таксама як дваццаць стагоддзяў таму прыйшоў у Бэтлееме. Ён нічога не адбірае, а толькі ўзбагачае духам мудрасці і любові, міласэрнасці і трываласці, а таксама адорвае супакоем, радасцю, шчасцем і новай надзеяй.

Таму неабходна адчыніць дзверы Хрысту, бо толькі ў Ім мы зможам пазнаць саміх сябе, як заклікае святы Ян Павел II, якому прысвечаны наступны Пастырскі год у Касцёле на Беларусі.

Віншую ўсіх вас з радасным і збаўчым святам Нараджэння Хрыстовага!

Віншую хрысціян, якія разам з намі яго адзначаюць!

Са словамі віншаванняў звяртаюся да нашых братоў і сясцёр праваслаўных, якія праз два тыдні будуць адзначаць свята Божага Нараджэння!

Віншую ўсіх людзей добрай волі!

Сын Божы стаўся чалавекам, каб мы ў вымярэнні Божай ласкі сталіся багамі. Таму не будзьма баяцца ў мітусні сучаснага свету і святочных клопатаў знайсці час для Езуса! Не будзьма баяцца прыняць Яго ў нашыя сэрцы! Не будзьма баяцца, бо святло бэтлеемскай зоркі дае нам новую надзею, нават насуперак надзеі!

Са святам Нараджэння Хрыстовага і надыходзячым Новым годам!

Даручаючы ўсіх вас апецы Багародзіцы, якая нарадзіла свету Збаўцу, свае святочныя пажаданні ўмацоўваю благаслаўленнем у імя Айца, і Сына, і Духа Святога. Амэн.

**Архіепіскап Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ,**
**Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі,**
**старшыня Канферэнцыі каталіцкіх епіскапаў у Беларусі.**

# ПРЫЕМНАЕ З КАРЫСНЫМ

**З 26 снежня да 11 студзеня пройдуць школьныя зімовыя канікулы — самыя працяглыя ў бягучым навучальным годзе. Для дзяцей у гэты перыяд падрыхтаваны разнастайныя мерапрыемствы.**

— Будзе арганізавана работа аздараўленчых школьных лагераў. Большасць з іх — з дзённым знаходжаннем, там адпачне каля 70 тысяч вучняў, — расказала **кансультант галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК.** — Такая форма адпачынку запатрабаваная, бо бацькі ўпэўненыя, што дзеці будуць знаходзіцца пад кантролем і іх вольны час зробяць цікавым і змястоўным. Канікулы — гэта і спрыяльны час для правядзення фізкультурна-аздараўленчых і спартыўных мерапрыемстваў, таму работа спартзалаў, стадыёнаў павінна быць забяспечана ў кожнай установе адукацыі.

Асноўная задача для педагагічных калектываў усіх школ краіны — стварэнне карыснага і бяспечнага адпачынку для вучняў. **Метадыст упраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Алена МІХАЛЕВІЧ** адзначыла, што асаблівая ўвага будзе аддавацца дзецям, якія знаходзяцца ў складаным сацыяльным становішчы і маюць патрэбу ў індывідуальным прафілактычным падыходзе.

— Дні зімовых канікул супадаюць са многімі святамі, якія могуць прынесці не толькі радасць, але і, напрыклад, траўмы. Таму ўжо зараз ва ўстановах сярэдняй адукацыі праводзяцца бацькоўскія сходы, размовы з дзецьмі з удзелам спецыялістаў розных структур аб правілах паводзін на лёдзе, на чыгуначных і аўтамабільных дарогах, важнасці выкарыстання ў цёмны час флікераў і іншае. Да таго ж зімовыя канікулы — найбольш спрыяльны час для дзяцей і падлеткаў, каб звярнуцца ў Рэспубліканскі цэнтр псіхалагічнай дапамогі, створаны на базе Інстытута псіхалогіі Беларускага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, калі гэта патрэбна. Там чакаюць як дзяцей, так і іх бацькоў, — акцэнтуе ўвагу Алена Міхалевіч.

Зімовыя канікулы для дзяцей — гэта і час забаўляльных мерапрыемстваў, навагодніх ранішнікаў для малых і вечароў для старшакласнікаў. Аб іх расказала **намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Ларыса ІСАЧКІНА.**

— Да 9 студзеня будзе доўжыцца навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці», якая ўжо каторы год праводзіцца па ініцыятыве Прэзідэнта. Падчас яе кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, а таксама грамадскія аб'яднанні наведаюць інтэрнаты і дамы сямейнага тыпу, апякунскія і прыёмныя сем'і, сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі, бальніцы, каб павіншаваць дзяцей з Новым годам і Калядамі. Цэнтральная падзея акцыі — навагодняе свята ў Палацы Рэспублікі, што адбудзецца 27 снежня. У ім возьмуць удзел больш за дзве тысячы дзяцей: гэта пераможцы алімпіяд, творчых конкурсаў, конкурсаў прафесійнага майстэрства і спартыўных спаборніцтваў; выхаванцы кадэцкіх вучылішчаў, спецыялізаваных ліцэяў, тыя, хто дасягнуў поспехаў у грамадскай рабоце; дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў; дзеці-інваліды, дзеці з шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў і іншыя, — адзначыла спікер.

Ларыса Ісачкіна дадала, што з 26 снежня да 11 студзеня ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі будзе працаваць Рэспубліканская выстаўка-конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці навучэнцаў «Калядная зорка». Тут жа падчас зімовых канікул пройдуць розныя навагоднія праграмы для дзяцей і падлеткаў: «Навагодняя прыгода: новая гісторыя старых сяброў», інтэрактыўнае прадстаўленне «Майстэрня Дзеда Мароза», для самых маленькіх — «Галоўнае чараўніцтва Новага года» і іншыя.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**



Фота БелТА.

# «ВАЛЬС ПАЧЫНАЕЦЦА. ДАЙЦЕ, СПАДАРЫНЯ, РУКУ!»

## Абласным навагоднім балем пачаліся ў Брэсце святочныя ўрачыстасці

**Раней у Брэсце праходзіў навагодні баль толькі падчас студзеньскіх музычных вечароў. І танцавалі калядным вечарам людзі, блізкія да мастацтва па роду дзейнасці. Зараз пакладзены пачатак новай традыцыі, калі на баль запрашаюцца прадстаўнікі таленавітай моладзі рэгіёна. Найлепшыя навучэнцы і студэнты з многіх устаноў вобласці, якія вызначыліся поспехамі ў вучобе, творчасці, спорце, прыбылі ў харэаграфічную школу мастацтваў імя Пагодзіна.**

З прывітальным словам да прысутных звярнуўся **намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь БАРЫСЮК.** Вечар пачаўся з урачыстага шэсця-паланэза. Потым пары закружыліся ў вальсе, які змянілі полька, французская кадрыля і іншыя танцы. Маладыя людзі рыхтаваліся да гэтага вечара, займаліся з харэографам, таму ў танцах сябе паказалі найлепшым чынам.

Цікава, што баль праходзіў у гістарычным будынку, які перажыў рэстаўрацыю. А памяшканне, у якім танцавалі пары XXI стагоддзя, так і называлася раней — бальная зала. Яе цудоўная акустыка зрабіла выступленне струннага квартэта выкладчыкаў Брэсцкага музычнага каледжа імя Р. Шырмы, асабліва яркім і запамінальным.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Гучная справа

# ШЛЯХ ГЕРАІНУ

**На мінулых выхадных стала вядома, што беларускія праваахоўнікі канфіскавалі самую вялікую партыю гэтага наркотыку за ўсю гісторыю Беларусі. Арганізаваная злачынная група выкарыстоўвала нашу краіну ў якасці перавалачнай базы паміж Афганістанам і Еўрасаюзам.**

Некалькі замежнікаў былі затрыманы ў сталіцы. У Мінску яны арандавалі складское памяшканне ў Заводскім раёне, дзе, уласна кажучы, і захоўваўся наркотык.

Падрабязнасці на брыфінгу расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі Генадзь КАЗАКЕВІЧ.**

— Для кантрабанды злачынцы выкарыстоўвалі так званы «паўночны» маршрут, які пралягае праз шэраг краін СНД. Аператыўнікі канфіскавалі амаль 550 кілаграмаў гераіну. Яго кошт на «чорным» рынку перавышае 50 мільёнаў еўра. З такога аб'ёму можна было прыгатаваць амаль два з паловай мільёны разавых доз. Пастаўка наркотыку ажыццяўлялася пад прыкрыццём камерцыйнай дзейнасці. Далейшая транспарціроўка ў Еўрасаюз мусіла праходзіць пад выглядам мэблі.

Следчы камітэт распачаў крымінальную справу па частцы 3 артыкула 328 Крымінальнага кодэкса. Абвінавачаныя змешчаны пад варту.

— Існуюць тры асноўныя маршруты кантрабанды гераіну ў Заходнюю Еўропу, — працягвае Генадзь Казакевіч. — Акрамя «паўночнага», існуюць таксама «балканскі» і «паўднёвы» — транзітам праз Пакістан у многія краіны свету. Самыя буйныя спажыўцы гераіну — ЗША, краіны Афрыкі і Заходняй Еўропы, перш за ўсё Вялікабрытанія, Францыя, Германія і скандынаўскі рэгіён. Беларусь жа знаходзіцца пад знешняй наркапагрозай як з захаду, так і з усходу. Яна непасрэдна ўплывае і на ўнутраную сітуацыю. Частка транзітных наркотыкаў асядае ў нашай краіне.

Сёлета наркакантроль выявіў і ліквідаваў 28 каналаў нелегальных паставак забароненых рэчываў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**


**Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества Государственного предприятия «СЛУЦКОЕ УПРАВЛЕНИЕ ПРОИЗВОДСТВЕННО-ТЕХНОЛОГИЧЕСКОЙ КОМПЛЕКТАЦИИ»**

**Таблица № 1**

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Козловой кран ТКК-5 инв. № 508 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 2880,00 | 14 | Конвейер в сборе КПС-800, инв. № 489 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 11430,00 |
| 2 | Кран балка 5 т, инв. № 515 | г. Слуцк, ул. Тутаринова, 19 А | 2520,00 | 15 | Бетоносмеситель СБ-169, инв. № 510 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 3600,00 |
| 3 | Кран мостовой инв. № 537 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 2520,00 | 16 | Воздуш. винтовой, инв. № 1357 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 15840,00 |
| 4 | Кран мостовой г/п 10 т, инв. № 546 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 12510,00 | 17 | Установка компрессорная ВК 100Р-84, инв. № 1560 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 13410,00 |
| 5 | Мостовой кран 5 т, инв. № 544 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 2520,00 | 18 | Бетоносмеситель С-773, инв. № 486 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 3690,00 |
| 6 | Кран мостовой 10 т, инв. № 542 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 12510,00 | 19 | Бетоносмеситель СБ-138, инв. № 475 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 3870,00 |
| 7 | Кран мостовой 12,5 т, инв. № 607 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 16470,00 | 20 | Бетоносмеситель, инв. № 476 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 3330,00 |
| 8 | Кран балка 16,5 м, инв. № 417 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 3780,00 | 21 | Грохот СДМ-225, инв. № 477 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 3690,00 |
| 9 | Транспортер ТК-18, инв. № 473 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 3780,00 | 22 | Компрессор ЕС РОТОР, инв. № 1523 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 12600,00 |
| 10 | Транспортер, инв. № 472 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 7650,00 | 23 | Машина контактной сварки МГ-1928УХЛ4, инв. № 4062 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 4230,00 |
| 11 | Транспортер ТК-18, инв. № 511 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 3780,00 | 24 | Линия пр-ва пустотных плит, инв. № 1638 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 661500,00 |
| 12 | Ленточный конвейер, инв. № 484 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 4770,00 | 25 | Бетоносмеситель, инв. | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 33840,00 |
| 13 | Конвейер в сборе КПС, инв. № 485 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 3960,00 | | | | |

В отношении вышеуказанных лотов проводятся первые повторные торги.

Публикация об аукционе ранее размещалась на сайте bankrot.gov.by объявление **№ 00044293**

| Таблица № 2 | | | | Таблица № 3 | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Вагон бытовка инв. № 295 | г. Слуцк, ул. Тутаринова, 19 А | 1 950,00 | 1 | Прицеп ТЦ 13 рег. знак А 4427 А-5 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 960,00 |
| 2 | Дом вагон инв. № 299 | г. Слуцк, ул. Тутаринова, 19 А | 2 025,00 | 2 | Автокран МАЗ 5334, рег. знак АВ 4532-5 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 3 960,00 |
| 3 | Станок СТД-9А инв. № 437 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 3 450,00 | 3 | Прицеп МАЗ 857100 010, рег. знак А 4554 А-5 | г. Слуцк, ул. Тутаринова, 19 А | 1 740,00 |
| 4 | Котельная в блоч. мэдул. исп. 6,5т. п/ч инв. № 1655 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 97 500,00 | 4 | Автомобиль GAZ-31105, рег. знак 1515 ЕК-5 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 840,00 |
| 5 | Газопровод высокого давления инв. № 1656 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 5 925,00 | 5 | Щетка дорожная НО-86 зав. № 1630 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 342,00 |
| | | | | 6 | Автомобиль MAZ 6422 A5-320, рег. знак АЕ 6800-5 | г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, 5 | 8 080,00 |
| В отношении вышеуказанных лотов проводятся вторые повторные торги | | | | В отношении вышеуказанных лотов проводятся третьи повторные торги | | | |
| Публикация об аукционе ранее размещалась на сайте bankrot.gov.by по лотам № 1-3 объявления **№ 00039172, № 00041136; по лотам № 4–5 объявления № 00039062, № 00044398** | | | | Публикация об аукционе ранее размещалась на сайте bankrot.gov.by объявления **№ 00039172, № 00041136, № 00044058** | | | |

**Задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Шаг – 5 % от начальной цены предмета торгов.**
**Окончание приема заявлений в 18.00 13.01.2020**

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.
Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затраты по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста – 5 % от начальной цены предмета торгов.**
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 15.01.2020 в 11.30 (регистрация участников с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержится на сайте https://orgtorg.by/info
До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344.
Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ГП «СУТПК» (Лот № __), проводимом __.__.2020 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с лотами. **Контактное лицо для осмотра: 8 029 691 36 99 (Александр Владимирович).**
Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.
Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».
**Снятие с гос. учета предмета торгов осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «Фрондера»: 8 (029) 305 86 50, e-mail: frondera@mail.ru, сайт https://orgtorg.by |
| **Продавец** | Государственное предприятие «СЛУЦКОЕ УПРАВЛЕНИЕ ПРОИЗВОДСТВЕННО-ТЕХНОЛОГИЧЕСКОЙ КОМПЛЕКТАЦИИ» в лице антикризисного управляющего ООО «Центр антикризисных проектов П-К» |



**ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует о переносе даты:**

– **Административное помещение,** общ. пл. 564 кв. м, инв. № 500/D-7077018, по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 2-3, назначенное на 30.12.2019 (публикация извещения в газете «Звязда» от 27.11.2019);

– **Административное помещение,** общ. пл. 645,6 кв. м, инв. № 500/D-7077019, по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 2-4, назначенное на 30.12.2019 (публикация извещения в газете «Звязда» от 27.11.2019);

– **Банк,** общ. пл. 1086,8 кв. м, инв. № 300/D-8183, по адресу: г. Гомель, ул. Новополесская 2-1а, назначенное на 30.12.2019 (публикация извещения в газете «Звязда» от 17.12.2019);

– **Административное здание,** общ. пл. 2105,9 кв. м, инв. № 500/С -15468, по адресу: г. Минск, ул. Филатова, 12, назначенное на 30.12.2019 (публикация извещения в газете «Звязда» от 21.12.2019);

– **Здание под вспомогательные помещения,** общ. пл. 863,2 кв. м, инв. № 200/С-30834, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 20А, назначенное на 30.12.2019 (публикация извещения в газете «Звязда» от 21.12.2019);

– **Административное встроенно-пристроенное помещение,** общ. пл. 1 149,1 кв. м, инв. № 100/D-82742, по адресу: г. Брест, ул. Московская, 346-269, назначенное на 30.12.2019 (публикация извещения в газете «Звязда» от 21.12.2019);

**Дата и время проведения аукциона: 14.01.2020** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Заявления на участие принимаются по 10.01.2020** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42, www.cpo.by УНП 191021390

Нашы дзеці

# СВЯТА ПАВІННА БЫЦЬ ВА ЎСІХ

**Прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС падчас рэспубліканскай дабрачыннай акцыі ўручыў навагоднія падарункі выхаванцам дзіцячага дома № 7 горада Мінска. Кіраўнік урада павіншаваў выхаванцаў і педагогаў з надыходзячым 2020 годам і пажадаў усяго самага добрага, светлага і радаснага.**


Фота БелТА.

— Мне вельмі прыемна знаходзіцца тут і бачыць, як малыя падраслі. Вы ведаеце, што па даручэнні нашага Прэзідэнта ўсе чыноўнікі і начальнікі робяць усё для таго, каб напярэдадні Новага года дзеці краіны адчулі паўнату гэтага свята.

Сяргей Румас выказаў надзею, што адыходзячы год быў для дзяцей шчаслівы, і пажадаў, каб усе праблемы сышлі ў нябыт. Асобныя словы падзякі і пажаданні здароўя Сяргей Румас адрасаваў педагогам дзіцячага дома.

— Я хачу, каб заўсёды памяталі: вялікую ролю ў тым, каб гэты год быў добрым, адыгралі выкладчыкі і выхавацелі, якія ўвесь час былі побач з вамі. Я шчыра віншую з надыходзячым святам і жадаю, каб Новы год прынёс толькі радасць і, вядома ж, ажыццяўленне тых патаемных жаданняў, якія ў вас ёсць.

Падчас навагодняга ранішніка прэм'ер-міністр вадзіў з дзецьмі карагод, праходзіў праз «чароўныя вароты», слухаў вершы і песні ў выкананні выхаванцаў дзіцячага дома. Потым кіраўнік урада ўручыў дзецям салодкія падарункі і сертыфікат на сем планшэтных камп'ютараў. Пры гэтым ён нагадаў малым, каб яны не забываліся пра меру падчас гульні на планшэтах, а лепш выкарыстоўвалі іх для навучання.

Пасля святочнага канцэрта прэм'ер-міністр накіраваўся папіць гарбаты разам з дзецьмі і выхавацелямі дзіцячага дома. Дзеці падарылі Сяргею Румасу мастацкую кампазіцыю на тэму Новага года, зробленую ўласнымі рукамі. Іх цікавіла, як дамагчыся поспехаў у працы, як прэм'ер-міністр адзначае Новы год і як адпачывае.

Сталічны дзіцячы дом № 7 для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, пачаў сваю работу ў 2000 годзе, і на сёння ў ім выхоўваецца 72 дзіцяці. Малыя жывуць у сямі кватэрах, якія аб'яднаны комплексам сацыяльна-бытавых памяшканняў: блокам харчавання, пральняй, медыцынскім блокам, бібліятэкай, трэнажорнай і камп'ютарнай заламі. Адным з прыярытэтных кірункаў у рабоце дзіцячага дома з'яўляецца перадача дзяцей у сем'і.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# З МІРНЫМ ГОДАМ!

## Дзеці воінаў-інтэрнацыяналістаў атрымалі прэзенты ад Дзеда Мароза і Снягуркі

**Казачных персанажаў забяспечылі ўсім неабходным дарослыя ўдзельнікі ранішніка — члены Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. Два дзясяткі дзяцей, чые бацькі — інваліды баявых дзеянняў у Афганістане, наведалі святочную імпрэзу і пачаставаліся салодкімі прысмакамі.**

А потым — самае доўгачаканае: сапраўдныя Дзед Мароз і яго ўнучка ўручылі малым спецыяльна падрыхтаваныя падарункі. Вядома, чараўнікі ніколі не памыляюцца, і кожны атрымаў менавіта тое, што хацеў, — «разумны» гадзіннік, лега-канструктар ці смартфон.

«Мая мара!» — ажно заскакала, запляскала ў далонькі адно дзяўчо, пабачыўшы ў руках Дзеда Мароза ролікавыя канькі.

«Калі чалавека не забываюць, памятаюць пра яго, — гэта самае асноўнае. Людзі перанеслі сур'ёзныя выпрабаванні, атрымалі раненні, сталі інвалідамі I, II груп. Але яны змаглі адшукаць сваё месца ў жыцці, стварыць сем'і, гадуюць цудоўных дзяцей — у тым ліку і трох, чатырох», — падкрэсліў **член Савета Рэспублікі, старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Валерый ГАЙДУКЕВІЧ.** Асабліва гэта актуальна сёлета, калі ўводу войскаў у Афганістан спаўняецца сорак гадоў.

У чараўніцтва вераць усе. Напэўна, калі рызыкуеш жыццём, яшчэ больш чакаеш цуду. Бо нават у Афганістане Новы год сустракалі — святочна.

«У маёй 8-й роце абавязкова святкавалі, і Дзед Мароз быў», — згадвае **кавалер двух ордэнаў Чырвонай Зоркі Аляксандр ЖАДАН.** Два яго старэйшыя сыны абралі ваенную прафесію. Шасцігадовы малы ведае: тата афганец, дэсантнік. Хлапчук, калі вырасце, таксама пойдзе па бацькоўскіх слядах — каб Дзеду Марозу больш ніколі не даводзілася прыходзіць на вайну.

А пакуль дзяўчынкі і хлопчыкі, калі і не вызначыліся з будучай прафесіяй, цвёрда ведаюць: будзе свята, падарункі, казка і залпы салютаў. Мірныя на роднай зямлі.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Давярай і правярай

# КАМУ ІКРАНЫ ПАШТЭТ,

## або Як набыць чырвоную ікру і не расчаравацца

**Днямі ў нашу суседскую суполку ў «Вайберы» «пастукаліся» пастаўшчыкі чырвонай ікры. Прапанавалі ікру фарэлі з Карэліі па 115 рублёў за кілаграм і ікру кеты з Сахаліна за 120 рублёў, расфасаваную па 250 грамаў у пластыкавыя кантэйнеры. Суседзі ажывіліся: хочацца ж паласавацца ікрой на Новы год і Каляды. На фота ікра выглядала вельмі апетытна, але калі набылі кантэйнер ікры фарэлі на пробу, то аказалася, што яна не вельмі якасная. Ікра была больш падобная... на паштэт — цэлых ікрынак працэнтаў дзесяць.Тыя, хто набыў, былі расчараваныя, маўляў, смачна, канешне, але такое на стол не падасі. Мне таксама захацелася набыць ікру, але, каб не быць падманутай, вырашыла падрыхтавацца да пакупкі.**

Першае, аб чым я даведалася, — цяпер бессэнсоўна падманваць пакупніка, прапануючы альгінавую ікру (гэта ікра з марскіх водарасцяў) замест натуральнай. Яна на смак увогуле не падобна на сапраўдную. Магчыма, на такі падман можа папасціся чалавек, які ні разу ў сваім жыцці не каштаваў гэты прадукт. Мне нават не ўдалося падмануць сваіх дзяцей: яны хутка мяне «раскусілі» і прысаромілі. Мае здагадкі пацвердзіла **начальнік Рэспубліканскага кантрольна-выпрабавальнага комплексу па якасці і бяспецы прадуктаў харчавання РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні», кандыдат сельскагаспадарчых навук Ірына ПАЧЫЦКАЯ:**


Абяцалі...

— Паколькі ікра з'яўляецца дарагім далікатэсам і яе набываюць перад святамі, то і пік зваротаў у нашу лабараторыю прыпадае прыкладна на гэты перыяд. І на самай справе часцей за ўсё прэтэнзіі звязаны не з «сапраўднасцю» ікры, а з якасцю.

Мае суседзі наглядзеліся ролікаў на «Ютубе», дзе давалі некалькі парад, як праверыць ікру на «натуральнасць», і таксама вырашылі паспрабаваць даведацца. Для гэтага неабходна было апусціць некалькі ікрынак на лыжцы ў гарачую ваду, і калі на ёй з'явілася каламутнае бялёсае адценне, то, маўляў, ікра сапраўдная. Але мяне гэты тэст не пераканаў. Такую рэакцыю дае бялок, які ўтрымліваецца ў чырвонай ікры. Але некаторыя нядобрасумленныя вытворцы могуць дадаць у сапраўдную ікру альгінавую і трошкі яечнага бялку, тады гэты тэст наўрад ці выявіць падман.

Сёння вытворцы могуць падрабіць не толькі колер ікры, але нават так званыя вочкі (зародкі) на кожнай ікрынцы. Так, напрыклад, у ікры з рыбінага тлушчу таксама ёсць «вочкі», вельмі падобныя на сапраўдныя. Ікрынку з таго ж рыбінага тлушчу расцiснуць таксама лёгка, як і натуральную, праўда, з распаўсюджанай альгінавай гэта зрабіць адразу не атрымаецца.


...І прапанавалі.

— Згодна з тэхнічнымі ўмовамі ікру падзяляюць на першы і другі гатункі, — дапамагае разабрацца Ірына Пачыцкая. — Ідэальная чырвоная ікра павінна адпавядаць патрабаванням ДАСТ 18173. Яна мае наступныя характарыстыкі: па вонкавым выглядзе ікра павінна быць аднаго віду рыб. Ікрынкі чыстыя, аднародныя па колеры, без плёнак і згусткаў крыві. Па кансістэнцыі і стане — ікрынкі пругкія, з лёгкай вільготнай або сухой паверхняй, рассыпістыя — павінны аддзяляцца адна ад адной. На пах і смак падобныя на свежую ікру гэтага віду, без чужароднага паху і смаку. Для другога гатунку ікры дапускаецца наяўнасць слабых вільготных ікрынак.

Дарэчы, ікра чырвоная можа належаць розным відам рыб, і кожная з іх мае некаторыя адрозненні. Напрыклад, самая распаўсюджаная ў крамах — **ікра гарбушы.** Яна часцей за ўсё сустракаецца ў продажы. У яе ўніверсальны смак, знаёмы амаль кожнаму, ярка-аранжавы колер і сярэдняга памеру ікрынкі з тонкай абалонкай. Буйныя ікрынкі гарбушы сведчаць аб нізкай якасці прадукту. Гэта пераспелая ікра з тоўстай абалонкай.

**Ікра фарэлі** таксама не лічыцца дэфіцытам. Ікрынкі ў гэтай рыбы дробныя і часта маюць выгляд зліплых, таму нярэдка выкарыстоўваюцца пры ўпрыгожванні канапэ і бутэрбродаў. Колер вар'іруецца ад цёмна-жоўтага да барвовага. У смаку прысутнічае прыкметная гарчынка.

**Ікра кеты** сярод іншых лічыцца далікатэсам і па праве з'яўляецца адным з эталонаў смаку зярністага прадукту. Ікра гэтай рыбы мае буйны памер, светла-аранжавы насычаны колер і пяшчотны сметанковы смак. Адметнай асаблівасцю ікры кеты з'яўляецца эфект раставання ў роце з-за тонкай абалонкі, якая лопаецца пры лёгкім націску на яе языком. Смак універсальны, без гарчынкі і рыбнага паху.

А вось **ікру нeркі** можа ацаніць толькі сапраўдны знаток з-за дастаткова насычанага пікантнага смаку з вельмі ўлоўнай гарчынкай. Ікрынкі дробныя, падобныя на ікру фарэлі, аднак маюць больш насычаны чырвоны колер.

**Ікра серабрыстага ласося (кіжуча)** мае досыць дробную структуру і гаркаваты прысмак, часцей за ўсё цёмна-чырвоная. Аднак, дзякуючы высокаму ўтрыманню вітамінаў і мінералаў, ікру кіжуча лічаць найбольш карыснай. Праўда, серабрысты ласось не здабываецца ў прамысловых маштабах, таму лічыцца каштоўнай рыбай.

Ёсць яшчэ **ікра чавычы,** або **каралеўскага ласося,** самага рэдкага прадстаўніка гэтага сямейства рыб. Ікра рыбы буйная і далікатная на смак з ледзь прыкметнай гарчынкай. Структура ікры аднародная, ікрынкі не зліплыя і лёгка аддзяляюцца адна ад адной.

Звычайна добрасумленныя вытворцы ўказваюць, чыя ікра выкарыстоўвалася пры вытворчасці. Нават на тым пластыкавым кантэйнеры, якую набылі мае суседзі, гэта было пазначана. Але, каб не падмануцца і не набыць няякасную ікру, Ірына Пачыцкая раіць набываць яе толькі ў крамах, якія маюць сертыфікаты і дазвол на гандаль.

— Купляючы ікру з рук, спажывец не застрахаваны ад фальсіфікаванага тавару, — гаворыць спецыяліст. — Набываючы ікру, перш за ўсё варта звярнуць увагу на кошт прадукту. Танная ікра можа быць няякасная або несапраўдная. Неабходна вывучыць інфармацыю на бляшанцы ці этыкетцы. Павінны быць указаны назва, вытворца, ДАСТ або ТУ на прадукцыю, дата вырабу ці ўпакоўкі, умовы захоўвання, тэрмін прыгоднасці, код завода-вытворцы, склад прадукту. Згодна з ДАСТ 18173, вытворцы таксама абавязаны нанесці дадатковую маркіроўку з указаннем віду рыбы, з якой выраблена ікра, а для ікры, фасаванай з бочак, павінна быць пазначана дата вырабу бочкавай ікры.

Я вырашыла не рызыкаваць і не набываць ікру праз нашу суседскую суполку ў «Вайберы». Тым больш што сёння часта можна знайсці далікатэс са зніжкай у крамах. Думаю, гэта не люкс будзе, але ўсё ж і не ікраны паштэт.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# МАЙСТАР-КЛАС ПАЧЫНАЕЦЦА З МАЛІТВЫ

**Я пазнаёмілася з Надзяй БУКАЙ на яе ўласнай выстаўцы выцінанак казачных герояў Пігласа і Басі. Чамусьці мне здавалася, што гэта наша не апошняя сустрэча. Так і атрымалася. Мне давялося трапіць на майстар-клас Букі ў Чырвоны касцёл Святых Сымона і Алены ў Мінску. За акном надвор'е зусім не святочнае, але ў касцёле адчуваецца інакш. Сабралася шмат моладзі: жартуюць, дастаюць свае загатоўкі для будучых паштовак, вострацьалоўкі. Заходзіць Надзя, вітае ўсіх і майстар-клас пачынаецца з малітвы. Пасля кароткага аповеду пра творчы шлях мастачкі здараецца цуд — папера пачынае ператварацца ў маляўнічыя паштоўкі. Надзя прапанавала некалькі варыянтаў і адразу ўсіх падбадзёрыла: «Намаляваць змогуць усе, галоўнае не ленавацца і не баяцца спрабаваць!» — кажа яна. І на самай справе паштоўкі атрымаліся ва ўсіх.**

**Таццяна ТКАЧОВА, фота аўтара.**







Надвор'е

# Невялікі марозік і доўгачаканы снег

**У першай палове тыдня ў нашай краіне надвор'ем будуць кіраваць атмасферныя франты і цёплыя паветраныя масы, якія рушаць з поўдня Еўропы. Чакаецца дажджлівае і цёплае надвор'е.**

У далейшым з заходнімі і паўночна-заходнімі вятрамі на тэрыторыю краіны пачне паступаць больш халоднае паветра з поўначы Скандынавіі. Тэмпературны фон пачне паступова паніжацца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Заўтра, у сераду, у святочнае 25 снежня, часам чакаюцца ападкі, у асноўным дождж, месцамі — слабы туман. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе змяняцца ад плюс 1 градуса да 7 цяпла. Аднак ужо ў чацвер надвор'е стане мяняцца. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі рэгіёна пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы галалёд. На працягу сутак будзе ад нуля да 6 градусаў цяпла, уначы пры праясненнях — да мінус 2 градусаў.

У пятніцу пахаладанне працягнецца, часам будзе невялікі мокры снег, месцамі слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад 2 градусаў марозу да 3 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу часам чакаецца невялікі снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак у асноўным складзе ад нуля да мінус 5 градусаў, толькі ўначы пры праясненнях паветра астыне да 7 градусаў марозу, а ўдзень па паўднёвым захадзе краіны максімальная тэмпература будзе дасягаць 1—2 цяпла. У нядзелю ўначы чакаецца ад 2 да 7 марозу, пры праясненнях тэмпература панізіцца да мінус 8 — мінус 10 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Новы год перасек мяжу

Гэтым разам загад на ахову дзяржаўнай мяжы і пропуск праз яе Новага года аддаваў пагранічнаму нараду не афіцэр-пагранічнік, а Дзед Мароз проста ў сваёй рэзідэнцыі каля пагранічнага слупа з нумарам «2020». Гэты незвычайны нарад заступіў на дзяжурства ў Белавежскай пушчы. Сам жа нарад быў сапраўдны — трое вартавых мяжы са службовым сабакам.

Святочны рытуал пропуску Новага года вайскоўцы Брэсцкай пагрангрупы праводзяць з 2008 года. Мерапрыемства кожны раз збірае шмат гасцей і становіцца асаблівым пунктам адліку свят. Новы год прапусцілі, значыць, можна яго сустракаць і святкаваць. Гэтым раз у пушчу прыехалі вучні дзвюх школ — 20-й і 31-й — абласнога цэнтра. Дзеці пабывалі на экскурсіі ў казачным маёнтку, пакінулі свае пажаданні на сімвалічным слупе, атрымалі сувеніры ад Дзеда Мароза. А паездка стала падарункам вучням ад Брэсцкага пагранатрада ў рамках акцыі «Нашы дзеці».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# «УЗЫШЛА Ў ЛЕСЕ ЁЛАЧКА...»

### По лясным білеце

Каб вырасціць адну прыгажуню на продаж, трэба як мінімум 4 гады, а то і ўсе 10. Для навагодніх дрэў у лясах адводзяцца спецыяльныя ўчасткі. Напрыклад, у Маладзечанскім лясгасе гэта 30 га зямлі, где на кожным гектары знаходзіцца каля 5000 дрэў. Ёлкі тут пастаянна даглядаюць спецыялісты. Яны стрыгуць іх, фарміруюць кроны, выкошваюць траву і высякаюць хмызнякі побач. А таксама глядзяць, каб дрэвы не сапсавалі шкоднікі і дзікія жывёлы і каб на плантацыю не трапілі браканьеры. Калі ёлка дасягае таварнага выгляду, на яе выпісваецца лясны білет. Пасля чаго яе высякаюць і вязуць на продаж.

— Зразумела, усе хочуць прыгожую і пушыстую ялінку на святы. Для гэтага дрэва не павінна хутка расці, таму мы высаджваем яго на не вельмі багатай глебе — вось і ўвесь сакрэт. Яшчэ ў лесе на маладыя дрэўцы амаль не трапляе святло, навагоднія ж плантацыі цалкам адкрытыя. Мы на вока вызначаем, якія ёлкі найбольш прывабныя. Напрыклад, аднабокія або з рэдкімі галінкамі наўрад ці купяць, таму такія дрэвы секчы няма сэнсу, — расказвае **галоўны ляснічы Маладзечанскага лясгаса Андрэй ШЫБЕКА.** — У асноўным людзі бяруць невялікія ялінкі — ад 0,5 да 2 метраў. Вышэйшыя — ад 5 да 20 метраў — заказваюць у нас выключна прадпрыемствы, у хату такую ёлку не паставіш. Дарэчы, сёлета ў адной з вёсак раёна мы высеклі ёлку вышынёй ажно 27 метраў, ёй было ўжо 90 гадоў. Вядома, шкада, але яна была аварыйная, перашкаджала мясцовым жыхарам. Цяпер гэта прыгажуня стаіць у сталіцы каля канцэртнай залы «Мінск».



Лясная ахова перайшла на ўзмоцнены рэжым работы. Тых, хто захоча здабыць навагоднюю ёлку бясплатна, чакаюць штрафы да 50 базавых велічынь.

### Найлепшае месца — балкон

У сярэднім ялінка можа прастаяць у хаце каля 3 тыдняў. Пажадана купляць дрэва з тоўстым ствалом і абавязкова звяртаць увагу на іголкі — яны не павінны асыпацца. Каб праверыць гэта, можна правесці рукой на галінцы. Нельга ставіць навагодняе дрэва каля батарэі, так яно хутка засохне.

— Не забывайце, што ёлка — гэта жывы арганізм, які, зразумела, мае патрэбу ў вільгаці. Таму пажадана адразу паставіць яе ў ваду і сачыць за тым, каб паветра ў памяшканні было вільготнае. Калі будзе суха, іголкі пачнуць хутка асыпацца. Таксама можна яшчэ апырскваць галінкі з пульверызатара, — раіць спецыяліст.

У апошнія гады беларусы ўсё часцей пачалі пытаць не пра ёлку, а пра сасну. А яшчэ аддаваць перавагу дрэвам у кадках. Калі ў 2017 годзе Маладзечанскі лясгас прадаў усяго 15 такіх ялінак, то ў 2018-м — ужо сто.

— Гэта добрая альтэрнатыва для тых, хто не хоча купляць ні ссечаную, ні штучную ёлку. Вясной такое дрэва можна пасадзіць. Але не заўсёды яно дажывае да гэтага часу, бо не ўсе правільна за ім даглядаюць, — падкрэслівае Андрэй Шыбека. — Ёлка ў кадцы не павінна знаходзіцца ў цёплым памяшканні больш за два тыдні, таму калі купілі яе загадзя, то адразу выносьце на балкон. Тое ж самае рабіце і пасля свят. Толькі так дрэва зможа перажыць зіму.


У апошнія гады беларусы ўсё часцей пачалі аддаваць перавагу дрэвам у кадках. У сярэднім такое дрэўца каштуе каля 15 рублёў.

### Пах іглiцы — водар свята

Эколагі пакуль не даюць адназначнага адказу, якая ёлка менш шкодзіць прыродзе — жывая ці штучная. Леснікі ж пераконваюць, што, нягледзячы на своеасаблівую моду на штучныя дрэвы, попыт на натуральныя ялінкі не памяншаецца. Толькі сёлета плануецца прадаць не менш за 160 тысяч навагодніх прыгажунь.

— Людзям падабаецца пах іглiцы. Хтосьці хоча парадаваць дзяцей, для кагосьці гэта традыцыя. Сам я выбіраю ёлку ў кадцы. Калі прынясу штучную, мяне з хаты выганяць, — смяецца спецыяліст.

З 20 снежня лясная ахова перайшла на ўзмоцнены рэжым работы. Устаноўлены сродкі фота- і відэафіксацыі, створаны рэйдавыя групы і стацыянарныя пасты каля дарог. Як правіла, браканьеры актывізуюцца да Раства і Новага года. Тых, хто захоча здабыць навагоднюю ёлку бясплатна, чакаюць штрафы да 50 базавых велічынь.

**Кацярына ЦІТОВА.**
**Фота аўтара.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ігуменскі тракт
№ 21 (243)

# ЯК ПАЧЫНАЛАСЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

**«Дзяржаўным народам прызнаецца той народ, які мае свае герб, гімн, сцяг, буквар і энцыклапедыю», — сцвярджаў некалі беларускі паэт Максім Танк. Словы класіка дарэчы і сёння, прынамсі на адкрыцці выстаўкі «Энцыклапедыя. Нацыянальны праект», якая пачала працаваць днямі ў музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі. Экспазіцыя прымеркавана да 50-годдзя стварэння першай беларускай універсальнай энцыклапедыі.**



nlb.by.

Выстаўка прадстаўляе гісторыю еўрапейскіх энцыклапедычных выданняў наогул — ад антычнасці да сучаснасці. Таму ў вітрынах знайшлося месца і «Натуральнай гісторыі» Плінія (у выданні XVI стагоддзя), і шэдэўру эпохі Асветніцтва, французскаму выданню «Энцыклапедыя, або Тлумачальны слоўнік навук, мастацтваў і рамёстваў» Дэні Дзідро (1751—1780), і найбольш аўтарытэтнай з англамоўных энцыклапедый «Брытаніцы» (1875—1888), а таксама Энцыклапедыі Бракгаўза, якая датуецца 1882—1887 гадамі, і энцыклапедыям на нацыянальных мовах, якія ўбачылі свет у XIX—XX стагоддзях у Польшчы, Чэхіі, Расіі і Украіне.

Але галоўная ўвага, натуральна, аддадзена энцыклапедыі беларускай як аднаму з самых важных складнікаў працэсу самаідэнтыфікацыі і самасвядомасці народа. «Сапраўды, многія народы існавалі і існуюць у свеце, але не ўсе з іх дайшлі да нацыянальнай спеласці і фарміравання ўласнай ідэнтычнасці, свайго светабачання, якое ў сістэматызаваным выглядзе паўстае праз універсальную энцыклапедыю. Энцыклапедыя — гэта погляд народа на ўвесь свет навокал і сваё месца ў ім», — зазначае на гэты конт **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь СУША.**

На выстаўцы шлях да нацыянальнага праекта адлюстраваны найбольш поўна. Тут сабраныя з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі і Нацыянальнага архіва, выдавецтва Беларуская «Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры архіўныя матэрыялы і выданні, якія паказваюць першыя спробы стварэння энцыклапедыі ў 20—30-х і 50-х гадах мінулага стагоддзя. Унікальныя дакументы, фотаздымкі і рабочыя матэрыялы дапамагаюць уявіць, як працаваў вялізны калектыў пад кіраўніцтвам галоўнага рэдактара, акадэміка і пісьменніка Петруся Броўкі. Асобна прадстаўлены вынік гэтай маштабнай навуковай і творчай работы — выданне-юбіляр, першая ў нашай краіне ўніверсальная «Беларуская савецкая энцыклапедыя» (яна стваралася з 1969 да 1975 года і складалася з больш як 34 тысяч артыкулаў і 12 тысяч ілюстрацый, якія ўвайшлі ў 12 тамоў), а таксама нацыянальнае выданне ўжо суверэннай рэспублікі — «Беларуская энцыклапедыя» ў 18 тамах (1996—2004). Убачыць усё гэта кніжнае багацце можа кожны карыстальнік бібліятэкі і наведвальнік сацыякультурнага цэнтра — выстаўка будзе працаваць да 17 лютага 2020 года.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Практычнае радзімазнаўства

# «НЕРАСКРУЧАНЫ» ЧОВЕН

## Па Іўеўшчыне з краязнаўцам

**Беларусь яшчэ хавае мноства сакрэтаў. Трэба толькі навучыцца іх заўважаць. Часам мясцовыя жыхары могуць здзівіцца: чаго гэта вучоныя людзі з Мінска цягнуцца, каб паглядзець на валун, што валяецца ў чыстым полі? І што яны шукаюць каля крыніцы? А чаго бадзяюцца па старых могілках? Чаму так радуюцца, калі ім баюць старыя казкі?**

**Калі выбіраешся ў вандроўкі з этнагістарычным цэнтрам «Явар», вучышся шукаць кавалачкі старажытнасці, спасцігаць светапогляд продкаў, здзіўляцца іх мудрасці і фантазіі, а, магчыма, і больш любіць сваю зямлю. Бо ёсць чым ганарыцца. У нас столькі захавалася паданняў, казак, павер'яў, звычаяў, абрадаў! Не кожны народ можа сёння пахваліцца такой памяццю!**

«Явар» аб'ядноўвае навукоўцаў і аматараў. За дваццаць гадоў, як існуе аб'яднанне, здзейснена ўжо больш за сотню вандровак. У падарожжах па розных рэгіёнах Беларусі даследчыкі (археолагі і гісторыкі) збіраюць каштоўную інфармацыю, распытваюць, запісваюць, правяраюць, ці захаваліся пэўныя легенды, звязаныя з рознымі сакральнымі аб'ектамі беларусаў: крыніцамі, камянямі, узгоркамі. Кожны маршрут распрацоўваецца загадзя, яму папярэднічае работа ў архівах і бібліятэках. Робіць гэта звычайна **кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік Інстытута гісторыі НАНБ Людміла ДУЧЫЦ.** Многа падказак даюць краязнаўцы. Калі назбіраецца звестак пра некалькі розных аб'ектаў, што знаходзяцца ў пэўным рэгіёне, вандроўнікі скідваюцца на арэнду аўтобуса. Разам з навукоўцамі на пошукі духоўных скарбаў выбіраюцца пісьменнікі, настаўнікі, мастакі, журналісты, наогул, далучыцца можа любы ахвочы. Дарэчы, шыкоўны «лайфхак» для іншых навукоўцаў, дзе ўзяць сродкі, каб правесці «палявыя» даследаванні: дастаткова проста знайсці людзей, якім будзе цікава назіраць за вашай работай.



Магіла ахвяры маланкі.

Падчас вандровак з «Яварам» ёсць магчымасць патрапіць у невялікія вёсачкі, а часам і глухія куточкі. Тут чуеш легенды, некаторым з якіх сотні гадоў. Даведваешся, што пакланіцца пэўнаму каменю ці крыніцы людзі хадзілі з паганскіх часоў. Дзякуючы фантазіі продкаў камяні маглі «расці», ажываць ці нагадваць, што раней яны былі людзьмі ці жывёламі, якія скамянелі за тое, што парушылі пэўныя правілы...

### ПОБАЧ З БАГАМІ

Менавіта камяні распавядаюць, што багі жылі побач з беларусамі, не строілі з сябе невядома каго (Бог мог паўстаць перад людзьмі ў выглядзе жабрака). Ды хадзілі яны па зямлі. І нават у некаторых месцах яшчэ засталіся іх сляды. Такі камень-следавік ёсць і ў Іўеўскім раёне. І ніколі б даследчыкам з «Явара» не адшукаць камень, які нашы продкі прызналі асаблівым, відаць, яшчэ ў дахрысціянскія часы, калі б не мясцовы **краязнавец, настаўнік гісторыі Лелюкінскай школы Андрэй ВАЎЧОК.**

Валун у вёсцы Каўшары яшчэ і цяпер завуць каменем Дзевы Марыі. Кажуць, што на ім адбіўся яе слядок.

— Неяк у нас у школе зайшла гаворка пра камяні, адна з вучаніц паведаміла, што ў мясцінах, дзе жыве яе бабуля, быў валун з легендай, — расказвае краязнавец.

Дзеці разам з настаўнікам узялі «шэфства» над каменем, ачысцілі яго ад моху, распыталі мясцовых жыхароў пра легенды, з імі звязаныя. На жаль, следавік быў ссунуты з месца падчас меліярацыйных работ, а раней, сталыя людзі расказвалі, насупраць яго ляжаў яшчэ адзін валун, па форме падобны на крэсла. Раней дзятва бавілася тым, што хтосьці з малых уладкоўваўся ў такое каменнае ложа, выцягваў нагу, каб ступнёй патрапіць у слядок-адбітак, які пакінула Божая Маці.

Таксама краязнавец паказаў нам яшчэ адзін камень — Баранішкінскі, але ўжо з больш маладым паданнем — тут, кажуць, у Паўночную вайну спыніліся шведы і рэзалі бараноў (часам людзі скажаюць паданне і выдаюць новую версію — бараноў смажылі ўжо немцы).

### АДНА ПАЕЗДКА — ДЗВЕ СЕНСАЦЫІ

Але найбольш даследчыкаў зацікавіла кропельніца — невялікі талеркападобны камень, у паглыбленні якога



Кавалак каменнай сякеры.

можа змясціцца каля двух вёдзер вады. Такія «вырабы» вельмі архаічныя, па камені відаць, што над ім у старажытнасці пачаравалі людзі. Аказалася, што каменьчык прыглянуўся аднаму мясцоваму жыхару (ён натрапіў на яго ў лесе, калі збіраў грыбы) і той вырашыў перацягнуць яго на свой участак.

— Гэта ўнікальная знаходка, такіх адзінкі. Пакуль вядомы толькі два месцы, — радуецца Людміла Дучыц, робячы замеры каменнай кропельніцы.

Але ў той дзень Андрэй Ваўчок падрыхтаваў даследчыкам яшчэ адзін сюрпрыз — у бібліятэцы аграгарадка



Людміла ДУЧЫЦ робіць замеры кропельніцы.

Морына захоўваецца човен, якому не менш за 300 гадоў. Яго паднялі са дна Нёмана яшчэ ў 70-я гады, пэўны час знаходка прасушвалася проста ў хляве.

**Бібліятэкар Таццяна КАРЭНДА** расказвае, як даўней лавілі рыбу. Каб загнаць яе на мелкаводдзе, патрэбна было некалькі лодак. Рыбачылі ўначы, рыбіны сплываліся на святло ад смалякоў ці лучыны. «Сёння такая рыбалка лічылася б браканьерствам, хоць насамрэч яна даволі экалагічная. Восцямі можна забіць толькі старую рыбу, што павольна плавае», — заўважае Таццяна Яўгенаўна.

У краязнаўчым кутку ў бібліятэцы таксама заўважаем акамянеласці, якія знайшлі ў Нёмане. І адкуль у рацэ ўзяліся марскія трылабіты? А таксама Таццяна Яўгенаўна паказвае нам кавалак каменнай сякеры, яе знайшлі ў дубе: «Некалі па беразе Нёмана былі цэлыя бары. Дрэвы падалі ў ваду, а людзі з цягам часу выцягвалі іх і нарыхтоўвалі мораны (чорны) дуб. Адзін такі пачалі рэзаць пілой і наткнуліся на камень. Відаць, з дрэвам нейкі старажытны дрывасек не змог саўладаць, зламаў сваю сякеру»...

Напэўна, ваенным гісторыкам будзе цікава яшчэ знаходка Андрэя Ваўчка — магіла 1916 года, дзе пахаваны вайсковец, што ў гады Першай сусветнай вайны загінуў ад... удару маланкі.

### ВЯСКОВЫЯ СВЯТЫНІ

Мы проста заехалі паглядзець на каменную кропельніцу, што захоўваецца ў касцёле ў вёсцы Лаздуны, а ад ксяндза Анджэя Бурака даведаліся і пра гісторыю і традыцыі гэтага куточка, і зноў жа пачулі цікавую легенду, што раней храм стаяў у суседняй вёсцы, за пяць кіламетраў ад гэтага месца. Быў ён драўляны. Наляцела бура, раскідала храм, а дах перанесла сюды.

У вёсцы Урцішкі знаёмімся з **Марыяй ДЗЯДУЛЬ,** яна адкрывае нам мясцовую капліцу, за якой глядзяць, аздабляюць, скідваюцца на рамонт самі вяскоўцы. У 80-х гадах кабеты нават па зямлі на каленях поўзалі, толькі б у іх гэты будынак пад клуб не забралі.

З капліцай таксама звязана легенда. Раней тут стаяла толькі фігура Маткі Боскай. Але неяк сасніў жыхар з іншай вёскі, што плача фігура, бо ненакрытая, прыскакаў на кані, расказаў свой сон, яшчэ і грошай на ахвяру даў. Было гэта перад вайной. Будавалі капліцу ў 1926 годзе ўсёй вёскай, пан даў лесу, на астатняе скідваліся...

«У нас бальдах ёсць, красівыя вельмі харонгі стаяць, а насіць няма каму. Раней на фэсты за сотню людзей прыходзіла. Хадзілі кругом каплічкі. Як стала мала людзей, дзяцей ужо няма, няма каму цвяты пасыпаць. Як хто ўжо памрэ, мы ад гэтуль хаваем, з капліцы сваей. Тут хрысцяць. І шлюбаў шмат бралі маладыя. Многа было народу па хатах, па 15—20 чалавек. Вёска была вельмі рэлігійная, а пеўчая... То гэта не знаем, дзе артысты такія ёсць. А тады, як адкрыла савецкая ўлада гарады, усе схлынулі, толькі гэта стар'ё дажываць пакінулі. Многа нашых у Вільнюсе, Лідзе, Мінску, параз'язджаўшыся па гарадах»...

На жаль, цемра перашкаджае далей працягваць пошукі... Але як многа ўражанняў і адкрыццяў падарыла Іўеўшчына ўсяго толькі за адзін дзень! І як прызнаюцца сябры «Явара», з такімі ўражаннямі яны вяртаюцца з кожнай вандроўкі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Сугучча

# «ЯК ЗВЯРЫ, ШТО БЛУКАЮЦЬ У ПУШЧЫ...»

## Урывак з прадмовы Францыска Скарыны да кнігі «Юдзіф» гучыць на 70 мовах народаў свету

**Чацвёртым выданнем пабачыў свет анталагічнага характару зборнік «Францыск Скарына на мовах народаў свету», які ўключыў пераклады з легендарнай прадмовы першадрукара да кнігі «Юдзіф» на 70 моў, у тым ліку — і на беларускую (арыгінал жа пададзены, зразумела, на старабеларускай). «Як звяры,/ што блукаюць у пушчы,/ ад нараджэння/ ведаюць сховы свае,/ як птушкі,/ што лётаюць у паветры,/ помняць/ гнёзды свае,/ як рыбы,/ што плаваюць у моры і ў рэках,/ чуюць/ віры свае/ і як пчолы/ бароняць вуллі свае — / гэтак і людзі/ да месца, дзе нарадзіліся/ і ўзгадаваны ў Бозе,/ вялікую ласку маюць» (пераклад Алеся Разанава).**

Акрамя беларускай, урывак надрукаваны ў пераўвасабленнях на рускую, аварскую, агульскую, азербайджанскую, арабскую, армянскую, балгарскую, балкарскую, бурацкую, верхнялужыцкую, в'етнамскую, даргінскую, іспанскую, італьянскую, іўрыт, кабардзінскую, казахскую, калмыцкую, каракалпакскую, карацінскую, карэйскую, кіргізскую, кітайскую, комі, крымскататарскую, кумыкскую, курдскую, лакскую, латгальскую, лезгінскую, літоўскую, македонскую, мангольскую, марыйскую, нагайскую, нанайскую, ніжнялужыцкую, нямецкую, польскую, пушту, румынскую, русінскую, рутульскую, саамскую, сербскую, славенскую, табасаранскую, таджыкскую, татарскую, тацкую, тувінскую, турэцкую, удмурцкую, узбекскую, уйгурскую, украінскую, фінскую, французскую, хакаскую, цахурскую, чачэнскую, чувашскую, чэшскую, шведскую, шорскую, эстонскую, якуцкую, японскую мовы.

Сярод перакладчыкаў — знакамітыя паэты, якія працуюць у розных нацыянальных літаратурах: азербайджанец Чынгіз Алі аглу, армянін Эдвард Мілітанян, узбек Улугбек Есдаўлетаў, кітаец Гаа Ман, мангол Галаарыд Бадам-Ачырын, таджык Саідалі Мамур, татарын Рэнат Харыс, удмурт Вячаслаў Ар-Сяргі... Упершыню зборнік «Францыск Скарына на мовах народаў свету» быў выдадзены ў 2014 годзе. У наступных выданнях — 2015 і 2016 гадоў і, зразумела, 2019 года — колькасць моў на якія здзейснены пераклады, пашырылася.

Што цікава, на некаторыя мовы змешчаны па два і болей перакладаў. На беларускую — тры (Алеся Разанава, Івана Саверчанкі, Сяргея Панізьніка), на рускую — таксама тры (Уладзіміра Беразева, Алега Буркіна, Валерыя Грышкаўца), на армянскую, балгарскую, крымскататарскую, марыйскую, удмурцкую, чачэнскую, чэшскую — па два. На сербскую змешчана чатыры пераўвасабленні: іх ажыццявілі Радміла Рысціч, Іван Чарота, Саманта Рац, Даяна Лазаравіч. Іван Чарота, як вядома, — беларускі сербіст, доктар філалагічных навук, ды разам з тым яшчэ і акадэмік Сербскай Акадэміі навук (настолькі высокі аўтарытэт нашага суайчынніка ў Сербіі як даследчыка сербскай літаратуры, культуры, як перакладчыка сербскай паэзіі, прозы, публіцыстыкі на беларускую і рускую мовы!). Радміла Рысціч — перакладчыца Скарыны і на нямецкую мову. А яшчэ па-нямецку тэкст Францыска Скарыны загаварыў дзякуючы Норберту Рандаву і Уладзіміру Чапегу, Аляксандру Філюту, Вікторыі Андрэевай.

Цікавымі падаюцца лёсы Норберта Рандава і Уладзіміра Чапегі, якія паядналіся ў адным перакладчыцкім клопаце. Норберт Рандаў, які нарадзіўся ў 1929 годзе, вывучаў славістыку ў Берліне да 1953 года. Пасля — у Сафіі. Працаваў у Берлінскім універсітэце імя Гумбальта. У 1962—1965 гадах знаходзіўся за кратамі — «за антыдзяржаўную прапаганду» і «дапамогу нелегальнай эміграцыі» з ГДР. Канешне ж, з такім «тлустым» радком у біяграфіі пра навуковую кар'еру і ў ГДР марыць не даводзілася. Родная сястра славіста Гундула Рандаў выйшла замуж за беларуса Уладзіміра Чапегу, які нарадзіўся на Гомельшчыне. Менавіта Уладзімір Чапега (1939—2014) падштурхнуў спадара Норберта да цікаўнасці да беларускай літаратуры. Як вынік — знаёмствы з Васілём Быкавым, Уладзімірам Караткевічам, Янкам Брылём, Алесем Разанавым, Рыгорам Барадуліным, Уладзімірам Арловым. У 2003 годзе ў фондах Верхнялужыцкай навуковай бібліятэкі ў Гёрліцы Н. Рандаў знайшоў невядомы дагэтуль беларусістам асобнік пражскага выдання «Бібліі» Францыска Скарыны. Нямецкі перакладчык пераўвасобіў на сваю родную мову творы Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага, Алеся Гаруна, Якуба Коласа, Янкі Купалы, Васіля Быкава. У мяне захаваўся ліст, з якім перакладчык у свой час даслаў пераклад урыўка з прадмовы Ф. Скарыны да кнігі «Юдзіф»: «Нойштрэліц, 4 ліпеня 2013 года.

*Паважаны спадар Алесь!*

*Толькі сёння пасылаю Вам пераклад на нямецкую мову тэкста Скарыны з яго прадмовы да «Кнігі Юдзіф». Пераклад зроблены сумесна Норбертам Рандавым (Norbert Randow) і мною, Уладзімірам Чапегам (Uladsimir Tschapeha), з арыгінала Скарыны.*

*Калі выйдзе запланаваная Вамі кніжка, то было б вельмі добра, калі б Вы пераслалі мне адзін яе экзэмпляр. Можна і на мой мінскі адрас. Там цяпер жыве мая сястра Клявенская Ніна Пятроўна. Калі ў мяне атрымаецца што-небудзь перакласці на рускую мову, то я тады звярнуся да Вас.*

*Усяго Вам добрага!*

*З павагаю, Ваш Уладзімір Чапега».*

На вялікі жаль, і Норберт Рандаў, і Уладзімір Чапега не паспелі пабачыць кнігу «Францыск Скарына на мовах народаў свету». Абодва пайшлі з жыцця раней, чым гэты праект увасобіўся асобным выданнем... Крыху — пра спадара Чапегу. У 1961 годзе перакладчык закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў. У 1962—1988 гадах служыў у Савецкай Арміі. Экстэрнам скончыў Данецкае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча інжынерных войскаў і войскаў сувязі (1973). Жыў у Германіі. У 1982 годзе перакладчыка прынялі ў Саюз пісьменнікаў СССР. Перакладаў з нямецкай мовы на беларускую і з беларускай на нямецкую. Дэбютаваў у друку ў 1971 годзе. На нямецкую мову пераклаў раман І. Мележа «Людзі на балоце», аповесці В. Быкава «Абеліск», «Здрада», А. Кудраўца «Раніца», кнігу У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі», творы Цёткі, Я. Брыля, К. Крапівы, П. Галавача, М. Гарэцкага, Я. Скрыгана... З нямецкай на беларускую пераклаў раманы Г. Ота «Пара ў дарогу, буслы», А. Аменды «Апасіяната», Л. Франка «Ісусавы вучні», творы Ш. Гермлінга, С. Цвэйга. Уладзімір Чапега адзначаны ордэнам «За заслугі перад Федэратыўнай Рэспублікай Германіяй».

Не меней цікавым перакладчыкам з'яўляецца Гаа Ман (1926—2017), які пераўвасобіў тэкст беларускага першадрукара на кітайскую мову. Яшчэ ў 1958 годзе ў Пекіне пабачыла свет кніга вершаў Максіма Танка ў перакладзе Гаа Мана. Кітайскі мастак слова пераклаў на сваю родную мову і кнігу Святланы Алексіевіч «Цынкавыя хлопчыкі», якая пабачыла свет у Пекіне ў 1990 годзе.

Несумненна, праца над своеасаблівай анталогіяй перакладаў твора Францыска Скарыны на розныя мовы патрабуе свайго працягу. Будзем спадзявацца, што да работы над пераўвасабленнем неўміручых радкоў, якія аднолькава значныя па сваёй патрыятычнай скіраванасці для народаў усяго свету, прычыняцца і перакладчыкі іншых краін Азіі, Афрыкі, Амерыкі, Еўропы. Францыск Скарына ідзе па свеце разам з Беларуссю, расказвае свету пра Беларусь і беларусаў.

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.**

# Ад Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь

## Аб работах, дапушчаных да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2020 года

У адпаведнасці з пунктам 9 Палажэння аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2006 г. № 300 «Аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь», з мэтай шырокага азнаямлення грамадскасці, прадстаўляецца інфармацыя аб работах і аўтарскіх калектывах, якія дапушчаны да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2020 года.

**Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі** паведамляе, што да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі 2020 года дапушчаны наступныя работы і аўтарскія калектывы:

***Галаваты Іван Іванавіч, Пятроўскі Андрэй Барысавіч, Барбікаў Дзмітрый Уладзіміравіч, Канаплянік Аляксандр Іванавіч, Доўнар Дзмітрый Мікалаевіч, Міхаленя Вячаслаў Дзмітрыевіч.*** Работа «Інавацыйныя тэхналогіі распрацоўкі радовішчаў калійных солей, развіццё высокатэхналагічных і навукаёмістых вытворчасцей і стварэнне сучаснай імпартазамяшчальнай высокапрадукцыйнай тэхнікі для іх здабычы і перапрацоўкі». Вылучана адкрытым акцыянерным таварыствам «Беларуськалій». Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі;

***Вягера Іван Іванавіч, Побаль Ігар Леанідавіч, Басякоў Міхаіл Нічыпаравіч, Залескі Віталій Генадзьевіч, Кавалеўскі Барыс Віктаравіч, Сцяпук Алег Георгіевіч.*** Цыкл работ «Распрацоўка высокаэнергетычных умацавальных і зварачных тэхналогій і арганізацыя вытворчасці экспартна-арыентаванага прамысловага абсталявання». Вылучаны дзяржаўнай навуковай установай «Фізіка-тэхнічны інстытут Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Прадстаўлены Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі;

***Пархомчык Пётр Аляксандравіч, Ільюшчанка Аляксандр Фёдаравіч, Руды Віктар Віктаравіч, Дэвойна Алег Георгіевіч, Жарскі Уладзімір Уладзіміравіч, Кашэўскі Яўгеній Пятровіч.*** Работа «Стварэнне і ўкараненне лазернай тэхнікі і тэхналогіі апрацоўкі матэрыялаў для павышэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі машынабудавання». Вылучана адкрытым акцыянерным таварыствам «БЕЛАЗ» – кіруючая кампанія холдынгу «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ». Прадстаўлена Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь;

***Суконка Алег Рыгоравіч, Красны Сяргей Анатольевіч, Алейнікава Вольга Вітальеўна, Кахнюк Віктар Ціханавіч, Малькевіч Віктар Ціханавіч, Палякоў Сяргей Львовіч***. Цыкл работ «Новыя метады дыягностыкі і лячэння анкалагічных захворванняў у дарослых і дзяцей». Вылучаны дзяржаўнай установай «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава». Прадстаўлены Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь;

***Лапа Віталій Вітальевіч, Цыганаў Аляксандр Рыммавіч, Пірагоўская Галіна Уладзіміраўна, Чарнякоў Дзмітрый Уладзіміравіч, Дармешкін Алег Барысавіч.*** Работа «Распрацоўка, вытворчасць і прымяненне новых форм комплексных мінеральных угнаенняў у Рэспубліцы Беларусь». Вылучана рэспубліканскім навуковым дачынным унітарным прадпрыемствам «Інстытут глебазнаўства і аграхіміі». Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі;

***Прывалаў Фёдар Іванавіч, Грыб Станіслаў Іванавіч, Казлоўская Зоя Аркадзьеўна, Кільчэўскі Аляксандр Уладзіміравіч, Кавалевіч Аляксандр Іванавіч, Рашэтнікаў Уладзімір Мікалаевіч.*** Работа «Стварэнне і выкарыстанне фонду генетычных рэсурсаў раслін Беларусі – асновы харчовай і біялагічнай бяспекі». Вылучана рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па земляробстве». Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі;

***Бакавец Мікалай Уладзіміравіч, Длугуновіч Вячаслаў Андрэевіч, Жагора Мікалай Адамавіч, Ісаевіч Анатоль Уладзіміравіч, Ніканенка Сяргей Віктаравіч, Тарасава Вольга Барысаўна.*** Работа «Стварэнне нацыянальнай сістэмы метралагічнага забеспячэння Рэспублікі Беларусь у галіне лазернай тэхнікі і оптыкі». Вылучана дзяржаўнай навуковай установай «Інстытут фізікі імя Б. І. Сцяпанава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі;

***Жураўскі Аркадзь Іосіфавіч (пасмяротна), Булыка Аляксандр Мікалаевіч, Крамко Іван Ігнатавіч (пасмяротна), Мяснікова Валянціна Уладзіміраўна, Федарэнка Ганна Уладзіміраўна.*** Работа «Лексікаграфічнае апісанне слоўнага фонду беларускай мовы XIV–XVIII стст. («Гістарычны слоўнік беларускай мовы» ў 37 выпусках)». Вылучана дзяржаўнай навуковай установай «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

**Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры** паведамляе, што да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры 2020 года дапушчаны наступныя аўтары і творчыя калектывы:

***Кузняцоў Вячаслаў Уладзіміравіч, Дудараў Аляксей Ануфрыевіч, Траян Юрый Антонавіч, Яромкіна Ірына Уладзіміраўна, Краўчанка Антон Яўгеньевіч, Кавалёў Юрый Андрэевіч.*** За работу «Балет В. Кузняцова «Вітаўт». Харэаграфія і пастаноўка Ю. Траяна». Вылучаны дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установай «Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь» сумесна з ГА «Беларускі саюз тэатральных дзеячаў» і УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

***Качан Канстанцін Іванавіч.*** За серыю жывапісных работ «Радзімай зачараваны» (2004–2017 гг.). Вылучаны ўстановай «Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

***Чаргінец Мікалай Іванавіч.*** За кнігі, якія садзейнічаюць умацаванню агульначалавечых каштоўнасцей і ідэй гуманізму: раман-дылогія «Вам – задание» і «За секунду до выстрела» (1982–1983 гг.), аповесць «Приказ № 1» (2016 г.), раманы «Илоты безумия» (1995 г.), «Сыновья» (1989 г.), «Операция «Кровь» (2013 г.). Вылучаны ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь;

***Бандарэнка Сяргей Афанасьевіч.*** За стварэнне твораў манументальнага мастацтва: рэльефнае пано «Песня пра зубра» для вестыбюля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (2006), стэла «Трыумф» і Алея алімпійскай славы (культурна-спартыўны комплекс «Мінск-Арэна», 2009), Конны помнік князю Альгерду (Віцебск, 2014), скульптурная кампазіцыя «Беларусь гасцінная» для палаца Незалежнасці (2015). Вылучаны ДУ «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь;

***Аляксееў Аляксандр Аляксеевіч, Лукашэвіч Алег Вацлававіч.*** За мастацкі праект «Спадчына Беларусі». Вылучаны ГА «Беларускі фонд культуры». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь;

***Касцючэнка Канстанцін Аляксандравіч.*** За стварэнне манумента «Брама памяці» ў мемарыяле «Трасцянец» (2015). Вылучаны УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь;

***Шаркоў Анатоль Васільевіч, Харашэвіч Алена Іванаўна.*** За рэалізацыю праекта «Жыць і помніць» і публікацыю серыі кніг: «Жить и помнить: Советские воинские захоронения в Европе», «Последний приют солдата», «Ставка Верховного главнокомандующего Русской армией в годы Первой мировой войны в событиях и лицах», «Обелиски памяти Русской Императорской армии Первой мировой войны», «По следам Советско-польской войны». Вылучаны ДУ «Беларускі культурны цэнтр духоўнага Адраджэння». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

***Крамарэнка Віктар Уладзіміравіч.*** За стварэнне архітэктурнага праекта «Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны». Вылучаны прадпрыемствам «Творчая майстэрня архітэктара Крамарэнкі В. У.» Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь;

***Гарцуеў Аляксандр Фёдаравіч***. За стварэнне высокамастацкіх твораў сцэнічнага мастацтва: спектаклі «Не мой» (2010), «Тры Жызэлі» (2013), «Раскіданае гняздо» (2013), «Кар'ера доктара Рауса» (2017). Вылучаны дзяржаўнай установай «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь;

***Ліхадзедаў Уладзімір Аляксеевіч.*** За стварэнне гісторыка-асветніцкага праекта «У пошуках страчанага» (2004 г.). Вылучаны рэдакцыйна-выдавецкай установай «Выдавецкі дом «Звязда». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Камітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь, падкамітэт па Дзяржаўных прэміях у галіне навукі і тэхнікі, падкамітэт па Дзяржаўных прэміях у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры звяртаецца да кіраўнікоў арганізацый, устаноў, вышэйшых навучальных устаноў, прадпрыемстваў, органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў з просьбай прыняць удзел у абмеркаванні пералічаных работ і аўтарскіх калектываў.

Водзывы спецыялістаў, матэрыялы грамадскага абмеркавання, прапановы і заўвагі па работах, аўтарскіх калектывах і аўтарах прымаюцца да 15 верасня 2020 года па адрасе: 220072, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 66, каб. 317, сакратарыят Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь.

Тэл. / факс (017) 284-24-56, (017) 284-23-81.

## Анатоль ФЕДАРОВІЧ:

# «МЫ МОЦНЫЯ, ТАМУ ШТО — КАМАНДА»

### Генеральны дырэктар прыватнага прадпрыемства «Праметэй» лічыць галоўным у сваёй рабоце клопат пра людзей



Дырэктар праектнага бюро «Дэльта» Таццяна ГАЙКЕВІЧ.

**Адна з вядучых будаўнічых кампаній Магілёўскай вобласці ў асаблівым прадстаўленні патрэбы не мае. У сваёй галіне даўно пазітыўна сябе зарэкамендавала. Сёння яна будуе жылыя дамы, адміністрацыйныя ды іншыя аб'екты па ўсёй краіне. Толькі за гэты год было пабудавана 23 266 квадратных метраў агульнай плошчы жылля ў Горках, Оршы, Магілёве і Дрыбіне. Акрамя гэтага, сіламі прадпрыемства або з яго ўдзелам узводзіцца і мадэрнізуецца шэраг аб'ектаў у Аршанскім раёне — МТФ на 2000 галоў у вёсцы Чурылава, Палац культуры льнокамбіната ў горадзе Орша, бальніца для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы Юрцы Аршанскага раёна. І зусім хутка завершацца работы на слаўгарадскім камбікормавым заводзе, дзе «Прамітэй» з'яўляецца генеральным падрадчыкам.**



Генеральны дырэктар Анатоль ФЕДАРОВІЧ.

## ДОМ ПАД КЛЮЧ

— У сваёй рабоце мы кіруемся перадавым вопытам і сучаснымі тэхналогіямі, — кажа **заснавальнік і кіраўнік прыватнага прадпрыемства «Праметэй» Анатоль ФЕДАРОВІЧ.** — Навука не стаіць на месцы, і мы павінны ісці з ёй у нагу. Напрыклад, выпускаем уцяплялнік, які ніхто акрамя нас у краіне не робіць. У 2015 годзе ён быў прызнаны на выстаўцы найлепшым прадуктам года. Гэта цалкам наша распрацоўка. А праект дома ў Магілёве, які распрацавала наша праектнае бюро «Дэльта», Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва ўнесла ў спіс праектаў для паўторнага выкарыстання. Ён адпавядае цэнавай палітыцы за квадратны метр, што існуе ў краіне. Што датычыцца жылля, якое мы будуем, то гэта на 50—60 % нашы ўласныя распрацоўкі.




«Перадавікі і наватары вытворчасці — наш залаты фонд», — сказала намеснік генеральнага дырэктара Валянціна ГУР'ЕВА, паказваючы Дошку гонару і медаль, заснаваны як грамадская ўзнагарода за бездакорную працу на прадпрыемстве.

— Наша праектнае бюро «Дэльта» было арганізавана ў 2006 годзе, каб дапамагчы прадпрыемству рабіць дамы «пад ключ», — удакладняе яго **дырэктар Таццяна ГАЙКЕВІЧ.** — У асноўным праектуем шматкватэрныя жылыя дамы і адміністрацыйныя памяшканні. Па атэстацыі наша група мае трэці клас складанасці. Іншымі словамі, можам праектаваць дамы вышынёй да 30 метраў — дзесяціпавярховікі. Дарэчы, не ўсякае прадпрыемства мае сваю праектную групу, звычайна ў найлепшым выпадку ёсць канструктарскія аддзелы.

— Дэвіз «Праметэя» — працаваць хутка, мабільна і якасна, — адзначае Таццяна. — Бачылі горацкі гандлёвы цэнтр «Брыльянт»? Гэта адзін з нашых першых праектаў з выкарыстаннем шкляных сцен. Дырэктар пабываў на выстаўцы за мяжой, убачыў там нешта падобнае і пажадаў, каб яно ўвасобілася і ў нас. Частка праектаў паўторна прымяняльная, але мы заўсёды перапрацоўваем іх і прывязваем да канкрэтнага будынка. Усё астатняе праектуем індывідуальна з улікам пажаданняў заказчыка.



Шматкватэрны дом на вуліцы Вакзальнай — адзін з будынкаў, узведзеных «Праметэем».

## ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ ПЕРШ ЗА ЎСЁ

У дырэктарскім кабінеце адна сцяна цалкам завешана ганаровымі граматамі і падзякамі.

— Гэта толькі за апошнія 3-4 гады, — усміхаецца Анатоль Федаровіч. — Для таго каб усе павесіць, сцен у кабінеце не хопіць. Мы не прывыклі працаваць дрэнна. І гэты год не быў выключэннем. Мы не толькі будуем, мы самі выпускаем і асноўную частку будаўнічых матэрыялаў. Для вытворчасці жалезабетонных вырабаў маем два жалезабетонныя вузлы плюс арэндуем памяшканні завода «Будаўнік», які знаходзіцца ў стадыі банкруцтва. У будучым плануем яго выкупіць. Акрамя гэтага ёсць цэх пліткі, вытворчасці пластыкавых вокнаў і дзвярэй, сэндвіч-панэляў, цэх дрэваапрацоўкі. Маем вялікі машынна-трактарны парк — болей за 100 адзінак рознай тэхнікі. Гэта вельмі важна для рэнтабельнасці прадпрыемства. Раней мы заказвалі вежавыя краны або бралі іх у арэнду. Цяпер у нас саміх пяць вежавых кранаў. І дзевяць экскаватараў рознай магутнасці. З такім паркам для нас не праблема праклaсці інжынерныя сеткі.

— Мы не шкадуем грошы на адукацыю, усе нашы вядучыя спецыялісты маюць пасведчанні прадпрыемства «Белбудліцэнзія» і Інстытута павышэння кваліфікацыі, — падкрэслівае кіраўнік. — У нашай камандзе працуе больш за 100 высакакласных спецыялістаў. Не эканомім і на замежных камандзіроўках, наведваннях выставак. Менавіта там можна падгледзець нешта такое, што зробіць нашу работу яшчэ больш высакакласнай. Вось і цяпер два нашыя спецыялісты едуць у Вену для ўдзелу ў выстаўцы па інавацыйным праектаванні будынкаў і збудаванняў.

Нядаўна наведваў выстаўку ў Дубаі і вельмі ўразіўся тым, як змяніўся гэты горад. Сорак гадоў таму я там быў падчас сваёй службы ў ваенна-марскім флоце. І самым вялікім будынкам на той час у іх лічыўся сціплы двухпавярховік. А сёння 130 аб'ектаў занесена ў кнігу рэкордаў Гінеса. Вось чаго яны дасягнулі за 40 гадоў. Гэта я кажу да таго, што на выстаўках можна ўзяць тое, што падыме на ўзровень вышэй. Цэх акон, жалезабетонныя вузлы, вытворчасць па выпуску сэндвіч-панэляў — абсталяванне для ўсяго гэтага мы бралі менавіта з выставак, бо яно вельмі высокатэхналагічнае.

## «СЭНДВІЧ» З ПЕНАПОЛІІЗАЦІАНУРАТУ «ПА-ПРАМЕТЭЕЎСКУ» НЕ ЖАДАЕЦЕ?

Прадпрыемства «Праметэй» з'явілася на свет дваццаць два гады таму дзякуючы ўпартасці Анатоля Федаровіча і яго жаданню зрабіць нешта годнае ў сваім жыцці. Сёння яно разраслося да памераў вялікай кампаніі з філіяламі ў Чавусах і Жлобіне. У Горках — цэнтральная база. І мы прайшліся па ёй разам з **намеснікам генеральнага дырэктара па вытворчасці Васілём КУХАРАВЫМ.**

Дом механізатара, рамонтная майстэрня, цэх па вытворчасці сэндвіч-панэляў, ПВХ-акон, растворабетонны вузел — ледзь пасяваем вярцець галавой. А Васіль Кухараў прапануе ацаніць арачнікі, зробленыя з уласнага «праметэеўскага» профілю, звярнуць увагу на тутэйшую вібрапрэсаваную плітку. «Па наш тавар нават Гродзенская вобласць прыязджае, — ганарыцца суразмовец. — На ўсю краіну працуем».

Заходзім у вялікае памяшканне, дзе адначасова размешчана некалькі цэхаў па вытворчасці халоднагнутых профіляў, металачарапіцы, трохслойных сэндвіч-панэляў з рознымі напаўняльнікамі. Нас сустракае Андрэй Хацяшоў, майстар па вытворчасці.

— На нашым прадпрыемстве людзі — галоўнае, — знаёміць з маладым спецыялістам Васіль Кухараў. — Калектыў згуртаваны, цякучкі амаль няма, шмат моладзі. Гэта вынік таго, што тут стабільная зарплата, вельмі добры сацпакет і ёсць магчымасць росту. Для маладых людзей гэта вельмі важна.

Ноу-хау прадпрыемства — трохслойныя сэндвіч-панэлі, якімі яно забяспечвае сябе і іншых. Вельмі добра ідуць вырабы з новым уцяплялнікам — пенаполіізацыянуратам ЭКАПІР. Мы адпраўляемся глядзець вытворчасць гэтага напаўняльніка. Велічэзныя блокі жаўтаватага колеру, якія ляжаць на ўваходзе, і ёсць гэты цяжкавымаўляльны прадукт. Але гэта яшчэ толькі загатоўкі, якія потым акуратна наразаюцца на вельмі дарагім амерыканскім абсталяванні. Яго некалькі гадоў таму Анатоль Федаровіч убачыў на адной з выставак.

— Уцяплялнік цікавы тым, што цалкам бяспечны: ён стойкі да ўзгарання, — рэкламуе інавацыйны прадукт намеснік генеральнага дырэктара. — Яго бяруць як для ўцяплення, так і для ахаладжвання. Спажывец з Краснадара, напрыклад, ім дахі пяціпавярховікаў засцілаў ад сонца.



Здымак зроблены ў цэху, дзе вырабляюць металапрофіль і металачарапіцу — прадукцыю, запатрабаваную ў розных галінах гаспадаркі. За дзейнасцю абсталявання сочаць машыніст Станіслаў ЛАГАЁЎ і аператар Дзмітрый БАЗЫЛЮК.



Вырабляюць на прадпрыемстве і ўцяплялнік новага пакалення з пенаполіізацыянурату ЭКАПІР. Яго нам паказалі майстар цэха Андрэй ХАЦЯШОЎ і машыніст Андрэй МАРЧАНКА.

## ВІНШАВАННЕ

*— Падводзячы вынікі, хочацца адзначыць, што год быў для нас прадукцыйны. Паказчыкі плюсуем да мінулага года прыблізна на 30 %. Але галоўнае, што ўсе жывыя-здаровыя, што абышлося без няшчасных выпадкаў на вытворчасці. Для нас гэта вельмі важна.*

*Хацелася б усіх, хто заняты ў нашай няпростай справе, абняць і шчыра павіншаваць. Дзякуй усім за каласальную работу. Будаўніцтва — гэта жыццё, або, як той казаў, барометр эканомікі. За 22 гады існавання наша кампанія стварыла сабе вельмі добрую рэпутацыю. Нам давяраюць, з намі жадаюць працаваць заказчыкі. На наступны год заказы ўжо на 70 % сфарміраваныя. І гэта пра многае сведчыць.*

*Шчыра віншую ўсіх работнікаў прадпрыемства «Праметэй» з Новым годам і Раством Хрыстовым. Жадаю, каб у вашых сем'ях было цёпла і ўтульна, каб вы з упэўненасцю глядзелі ў заўтрашні дзень, каб наша незалежная дзяржава толькі мацнела!*

**Генеральны дырэктар Анатоль Федаровіч.**

## МЕДАЛЬ ЗА САМААДДАНАСЦЬ




На прадпрыемстве нават заахвочваюць незвычайна. Тым, хто тут працуе 10 і болей гадоў, уручаюць медалі, прычым сваёй жа распрацоўкі.

— Асноўная частка маіх намеснікаў працуе на прадпрыемстве ўжо болей 20 гадоў, — кажа Анатоль Федаровіч. — І мы вырашылі, што такія дасягненні павінны быць адзначаны. Распрацавалі сабе ў арганізацыі медалі трох ступеняў — «Ветэран прыватнага прадпрыемства «Праметэй». Тым, хто адпрацаваў 10 гадоў, даём трэцюю ступень і 500 долараў у дадатак, хто 15 — другую ступень і 1000 долараў, хто 20 — першую ступень і 2000 долараў. Льготы таксама ёсць. Уладальнік медаля пры выхадзе на пенсію мае права раз на год узяць пуцёўку ў любы санаторый або прафілакторый краіны бясплатна.

Дарэчы, на прадпрыемстве такія медалі атрымаў 51 чалавек, у тым ліку 19, якія ўжо не працуюць. Існуюць і іншыя спосабы заахвочвання.

— Гэта вельмі важна, — лічыць генеральны дырэктар. — Я для сябе гэта засвоіў яшчэ са студэнцкіх часоў. У 1984 годзе быў камандзірам атрада «Праметэй» (дык вось адкуль назва прадпрыемства! — **Аўт.**) і атрымаў урадавую ўзнагароду. Для мяне гэта быў вялікі гонар. Два гады запар сярод сельскагаспадарчых ВНУ Савецкага Саюза мы трымалі першае месца.

## ПРАМЕТЭЙ АД СЛОВА «КЛАПАЦІЦЦА»

Дарэчы, менавіта такі сэнс мае гэтая назва ў перакладзе са старажытнагрэчаскай. Дабрачыннасць і ўвага на прадпрыемстве — не проста словы. Тут клапоцяцца не толькі пра сваіх работнікаў, але і пра тых, каму ў гэтым жыцці цяжка. Асаблівая ўвага — дзецям: так хочацца, каб на Новы год яны адчулі, што пра іх ніколі не забываюць. Прадпрыемства ўжо загадзя падрыхтавала салодкія падарункі для дзятвы. А апякуе яно ў раёне шмат каго.

— Аказваем спонсарскую дапамогу прыёмным апякунскім сем'ям, дзіцячым дамам сямейнага тыпу, — расказвае **Валянціна ГУР'ЕВА.** — Падчас дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» будзем віншаваць сям'ю Кураевых з вёскі Пална. А яшчэ Анатоль Федаровіч як дэпутат апякае сям'ю Цыркуновых са сваёй Акадэмічнай выбарчай акругі № 4. Сёлета дапамаглі гэтай сям'і сабраць дзяцей у школу. Вялікая спонсарская дапамога аказваецца школам № 2 і № 4, а таксама гімназіі і дзіцячым садкам. Навагоднія падарункі ад нас атрымаюць і выхаванцы Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дзіцячага прытулку ў вёсцы Рудкаўшчына і іншыя. Мы сабралі святочныя пакеты таксама для інвалідаў і ветэранаў з аддзялення кругласутачнага знаходжання ў аграгарадку Леніна. Зараз там знаходзіцца 20 чалавек.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, Алена ДАЎЖАНОК, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

## МЕСЦА ДЛЯ ДУШЫ

Анатоль Федаровіч, да таго як стаў будаўніком, быў мараком і жыць не мог без мора. Усю сваю любоў да стыхіі ён увасобіў у базе адпачынку «Мерэя». Знаходзіцца яна ў адным з найпрыгажэйшых месцаў Горацкага раёна — аграгарадку Леніна на аднайменным вадасховішчы. Марская рамантыка тут адчуваецца ва ўсім — і ў драўляных скульптурах, і ў пабудовах. І як напамін пра цёплыя краіны, дзе даводзілася служыць, тут з'явіліся экзатычныя паўліны і страусы. Упершыню ўбачыла, што страусы могуць так элегантна танцаваць, раскідваючы крылы і вырабляючы неймаверныя па.

— Наша гасцініца разлічана на 40 месцаў, плюс летнія домікі, — знаёміць з базай адпачынку яе **дырэктар Аляксандр ТАРАНАЎ.** — Да паслуг адпачывальнікаў працуе кавярня «Хваля» на 50 чалавек. А летам адкрытая яшчэ і веранда на 80 чалавек. Вельмі часта яе арандуюць для карпаратываў, вяселляў і іншых мерапрыемстваў.

На базе ёсць нават музей вясковага быту, які ініцыявала **намеснік генеральнага дырэктара Валянціна ГУР'ЕВА.** Яна ж збірае для яго экспанаты. На палічках стаяць патэфон, гарлачы, збаны, гладышы, у чырвоным куце вісіць вышыты ручнік.

На тэрыторыі базы ёсць цудоўнае месца, дзе б'юць крыніцы, і яно некалькі гадоў таму было абазначана купеллю. Яе ўрачыста асвяціў архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі ўладыка Сафроній.

Пакуль ідзём да капліцы, заўважаю табун коней. Дырэктар базы кажа, што ў будучыні тут збіраюцца катаць на іх усіх ахвотных. Акрамя коней у гаспадарцы ёсць авечкі, куры, гусі, качкі. А на прылягаючай тэрыторыі вырошчваецца разнастайная агародніна, якая ідзе на свае патрэбы і падшэфным арганізацыям у выглядзе спонсарскай падтрымкі — школам, дому састарэлых.

Вакол возера шмат альтанак з мангаламі. Летам тут можна пасядзець і з вудачкай. У возеры водзяцца карась, акунь, шчупак, таўсталобік.

Прадпрыемства, акрамя таго што дэманструе высокія паказчыкі ў рабоце, актыўна падтрымлівае спартыўны кірунак— на яго рахунку шмат узнагарод за перамогі ў спаборніцтвах. Праметэеўцы неаднаразова займалі прызавыя месцы па валейболе, баскетболе, гандболе, лёгкай атлетыцы.

На базе адпачынку праводзяцца ў тым ліку зімовая і летняя спартакіяды, удзел у якіх бярэ ўвесь калектыў.

— Падтрымліваем спартыўную форму, бо Горкі ўваходзяць у міжнародную еўрапейскую асацыяцыю «Здаровыя гарады, раёны і пасёлкі», — удакладняе Валянціна Пятроўна.

А яшчэ база адпачынку карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод расіян. Ад аграгарадка Леніна да Смаленска ўсяго 80 кіламетраў. І на Новы год палова месцаў ужо раскуплена менавіта расіянамі.



«На базе адпачынку «Мярэя» ёсць свой маленькі заапарк», — сказаў нам дырэктар базы Аляксандр ТАРАНАЎ.





Праваслаўная капліца і купель, пабудаваныя майстрамі «Праметэя», адзначаныя падзячнай граматай епіскапа Магілёўскага і Мсціслаўскага Сафронія.

УНП 700423316.

Актуальная размова

**Аляксандр БРУЧЫКАЎ:**

# ПОШТА — ГЭТА СВОЕАСАБЛІВЫ БІЗНЕС, І ТРЭБА ЯГО РАЗВІВАЦЬ

## Дырэктар Магілёўскага філіяла прадпрыемства паштовай сувязі «Белпошта» пра новыя віды паслуг, «мабільнага паштальёна» і заўтрашні дзень

**Аляксандр Бручыкаў у сістэме паштовай сувязі другі год, а сёлета ён узначаліў Магілёўскі філіял. Новы кіраўнік лічыць, што пошта — гэта бізнес, і трэба быць добрым стратэгам і тактыкам, каб вывесці прадпрыемства на прынцыпова новы ўзровень.**

**Дарэчы, стратэгія і тактыка для Аляксандра Міхайлавіча самыя што ні на ёсць родныя словы. Да нядаўняга часу ён служыў у праваахоўнай сістэме. Па спецыяльнасці інжынер-радыёэлектроншчык, закончыў Жытомірскае ваеннае вучылішча радыёэлектронікі войскаў супрацьракетнай абароны. У запас звольніўся ў званні палкоўніка.**



***— Аляксандр Міхайлавіч, на новай пасадзе вы ўсяго паўгода, наколькі ўпэўнена адчуваеце сябе на гэтым месцы?***

— Сапраўды, справа для мяне дастаткова новая. Але тут таксама ёсць пункт прыкладання. Калі працаваў у праваахоўнай сістэме, рабіў максімум намаганняў, каб развіваць інфармацыйныя тэхналогіі. У Магілёўскім УУС аўтаматызаваў працэсы інфармацыйна-аналітычнага цэнтра, экспертна-крыміналістычнага на той час аддзела, пашпартна-візавай службы і іншых. На пошце адразу ж прыступіў да прывядзення ў парадак аб'ектаў, а іх каля 400 па вобласці. Хочацца, каб умовы работнікаў і кліентаў былі нашмат лепшыя.

***— Заўважыла, што адбыліся некаторыя нават чыста знешнія перамены. А што наогул атрымалася зрабіць за такі яшчэ невялікі тэрмін, і якія планы на будучыню?***

— Як ужо адзначыў, раблю акцэнт на інфарматызацыю паслуг. Працягваем укараняць новыя тэхналогіі — гэта электронныя чэргі, каб кліент не губляў час, стоячы ў звычайных чэргах. Будзем актыўней прапагандаваць плацежныя тэрміналы, якія ў нас ёсць, але якімі не вельмі актыўна карыстаюцца. Начальнікам аддзяленняў даручана арганізаваць дзяжурства каля тэрміналаў паштовых спецыялістаў, каб дапамагаць насельніцтву праводзіць плацяжы.

Укаранёныя два паштаматы ў Магілёве і Бабруйску, якія дазваляюць у любы час дня і ночы адпраўляць і атрымліваць пасылкі. Гэта таксама змяншае чэргі ў паштовых аддзяленнях.

Акрамя інфармацыйных тэхналогій, якія зараз прапагандуе пошта, будзем аддаваць вялікую ўвагу прывядзенню ў парадак нашых пабудоў і памяшканняў для кліентаў. Каб у горадзе і на сяле было аднолькава камфортна, цёпла і ўтульна. Абнаўляем будынкі філіяла і вузла паштовай сувязі ў Магілёве і Бабруйску. Яны дастаткова старыя, таму прыйшлося цалкам замяніць тэхнічныя сеткі. Ствараем добрыя ўмовы працы сваім работнікам і кліентам. Шмат увагі ўдзяляецца раённым аб'ектам паштовай сувязі. У рамках бізнес-плана прыведзены ў парадак Клічаўскі, Касцюковіцкі, Кіраўскі вузлы паштовай сувязі. Не абыходзім увагай аддзяленні паштовай сувязі на вёсцы.

***— На развіццё заўсёды ўплываюць эканамічныя абставіны, у якіх прыходзіцца існаваць. Яны не заўсёды спрыяльныя. І трэба шукаць нейкае выйсце, каб быць на вышыні. Пошта сёння з'яўляецца шматфункцыянальным прадпрыемствам, шукае новыя формы абслугоўвання кліентаў. Раскажыце пра найбольш перспектыўныя з іх.***

— Найбольш перспектыўны кірунак — гэта нашы карпаратыўныя кліенты, таму плануем стварыць для іх найбольш спрыяльныя ўмовы. У Магілёве і Бабруйску існуюць спецыяльныя памяшканні — бізнес-пошты. У Бабруйску такая бізнес-пошта ўжо адрамантаваная (там заменена мэбля, цяпер возьмемся за Магілёў). Мы распрацавалі праект на рэканструкцыю будынка, збіраемся зрабіць наш галоўпаштамт больш камфортным і зручным, з адміністратарам на першым паверсе. І ў першую чаргу плануем рэканструяваць бізнес-пошту для работы з карпаратыўнымі кліентамі. На жаль, не ўсе кліенты ведаюць пра нашы паслугі. У прыватнасці пра паслугу «Аплачаная перасылка». Тыя, хто часта адпраўляюць пасылкі, лісты, дакументы, могуць без чаргі ажыццявіць перасылку адпраўленняў пэўнай велічыні — S, N, L. Для гэтага ў нас ёсць спецыяльныя гофракардонныя скрыні і пластыкавыя канверты. Недастаткова пакуль запатрабавана і паслуга «Паштовы кур'ер». Бывае, што не хапае часу прыйсці ў паштовае аддзяленне і стаяць у чарзе, а кур'ер зробіць усё нашмат хутчэй. Ён прыбывае па заяўцы на працягу гадзіны. Паслуга актуальная як для фізічных асоб, так і для юрыдычных. На жаль, вельмі мала хто гэтымі паслугамі карыстаецца. Відавочна, што проста не хапае інфармацыі.

***— А якія змяненні чакаюцца на сяле?***

— Сёння шмат увагі аддаецца развіццю інфармацыйных тэхналогій пры аказанні паштовых і няпрофільных паслуг. А таксама аказанню банкаўскіх паслуг, у тым ліку на сяле. Цяпер аддзяленні паштовай сувязі могуць дапамагчы з адкрыццём укладу, афармленнем крэдыту, банкаўскай карткі — такіх паслуг раней не было.

Асаблівая работа ўдасканальваецца там, дзе няма стацыянарных паштовых аддзяленняў сувязі і арганізаваны перасовачныя аддзяленні. У планах укараніць сістэму «мабільны паштальён», якая зараз апрабуецца ў Віцебскай вобласці. Гэта, па сутнасці, паштовае аддзяленне ў руках аднаго паштальёна. З дапамогай мабільнай праграмы ён можа аказваць розныя паслугі. Пакуль гэта плацяжы і падпіска, а плануецца зрабіць больш розных паслуг.

***— Чула, што зменіцца і знешні выгляд самога Магілёўскага філіяла «Белпошты», з'явіцца нейкая цікавая кампазіцыя, якая стане візітоўкай пошты Магілёўскай вобласці.***

— Кампазіцыя з паштальёнам каля будынка філіяла паштовай сувязі — гэта пакуль наша мара. Усё залежыць ад фінансаў. Мы знаходзімся ў цэнтры горада, і хацелася б неяк абазначыць наша месца. Плануем устанавіць скульптуру паштальёна на ўваходзе, каб можна было сфатаграфавацца на памяць. На Плошчы зорак ёсць паказальнік на наш галоўпаштамт. Але прыходзіш і не адразу пазнаеш наш будынак. Таму ўсе пакуль фатаграфуюцца на Плошчы зорак каля астролага, а маглі б і каля нас.

***— Калісьці перыёдыка і пошта былі ледзь ні словамі-сінонімамі. Цяпер да друкаваных СМІ крыху змяніліся адносіны.***

— Але пошта па-ранейшаму асацыюецца з друкаванымі сродкамі інфармацыі. Асабліва ў людзей старэйшага пакалення. Не ўсім даступны інтэрнэт, не ўсім ён і цікавы — газета зусім іншы прадукт. Яе прыемна раскрыць, патрымаць у руках. Я больш люблю друкаваныя кнігі чытаць, чым электронныя. Гэта жывое. Хочацца аднавіць падпіску, вярнуць да ранейшага ўзроўню. У газеце шмат інфармацыі на розныя тэмы, і не трэба дзесьці лазіць, нешта шукаць. І мы праводзім работу па папулярызацыі газеты ў рамках нашай ідэалогіі і любові да радзімы. Асацыяцыя паштальёна з газетай не павінна знікаць, яна павінна застацца актуальнай і для маладога пакалення. Праводзім прома-акцыі сумесна з прадпрыемствамі, знаёмім людзей з выданнямі.

***— Напярэдадні Новага года ў зале аблпошты паявілася прыгожая фотазона са стылізаванай пад стол паштовай скрыняй, крэслам і курантамі. Адчуваецца клопат пра кліента.***

— І вы не памыляецеся. Хочацца прывесці ў парадак усе нашы аб'екты па Магілёўскай вобласці, каб да нас ставіліся з павагай. Каб нарэшце звычайныя чэргі пераўтварыліся ў электронныя, якія рухаюцца нашмат хутчэй. Мы збіраемся купіць зарадныя ўстройствы, каб можна было падзарадзіць мабільнік. Узяў нумар у электроннай чарзе і, пакуль яна падыдзе, сядзі ў інтэрнэце. Ёсць задумка павесіць тэлевізары і даваць карысную інфармацыю. На некаторых аддзяленнях мы ўжо зрабілі гульнявыя куткі для дзяцей. Шмат увагі аддаецца людзям з абмежаванымі магчымасцямі. Нашы аддзяленні сувязі абсталяваны пандусамі, пад'ёмнікамі і кнопкамі выкліку, там, дзе паіншаму нельга вырашыць пытанне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з фондаў Магілёўскага філіяла «Белпошты».**

Прыемная навіна

# Новыя аб'екты — жыхарам Міншчыны

**На Міншчыне стала ўжо добрай традыцыяй напярэдадні свят рабіць для жыхароў падарункі. Не выключэнне і гэты Новы год.**

## САЦЫЯЛЬНЫ ДОМ

У Маладзечне ўрачыста адкрылі новы жылы дом сацыяльнага карыстання. Тут налічваецца 31 аднапакаёвая кватэра, у тым ліку 28 прызначаны для дзяцей-сірот, што засталіся без апекі бацькоў, і дасягнулі 23-гадовага ўзросту. Гэтыя маладыя людзі не мелі магчымасці па незалежных ад іх прычынах рэалізаваць сваё права на атрыманне жылых сацыяльных памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду ва ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны. Дзве кватэры выдзелены непрацуючым адзінокім інвалідам 1-й і 2-й груп, адна — інваліду, у якога сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і не перавышае зацверджанага бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. Акрамя таго, у 24 двухпакаёвыя кватэры засяляцца тры малазабяспечаныя шматдзетныя сям'і, у 21 з іх грамадзяне, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў.

## «РАЗУМНАЯ» ФЕРМА

У філіяле ААТ «БЕЛАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ» — СВК «Першамайскі» ўведзена ў эксплуатацыю новая малочнатаварная ферма, разлічаная на 774 жывёліны. Плошча новага комплексу 13,4 тысячы квадратных метраў. На яго будаўніцтва затрачана 7,9 мільёна рублёў. Тут створаны ўсе ўмовы для бяспрывязнага ўтрымання статку. Даільны блок аснашчаны высокатэхналагічным абсталяваннем, аўтаматычнымі сістэмамі кантролю якасці прадукцыі, кіравання даільным працэсам, што дазваляе весці ўлік надояў асобна па кожнай карове.

Укараненне прагрэсіўных тэхналагічных рашэнняў дае магчымасць павялічыць гадавую вытворчасць малака амаль у паўтара раза, павысіць яго таварнасць на 4 %, значна скараціць расходы кармоў.




## АБНОЎЛЕНЫ ВАКЗАЛ

Дваццатага снежня ў Вілейцы адкрыўся значна папрыгажэўшы аўтавакзал. Аб'ект закрыўся на рэканструкцыю ў чэрвені 2019 года. За гэты час знешні выгляд будынка кардынальна змяніўся: заменены дах, вокны, праводка, сантэхніка, вентыляцыя, каналізацыйная сістэма, уладкаваны вітражы. Сродкі былі выдзелены з абласнога бюджэту.

На аўтавакзале маецца шэсць пасадачных платформаў. Па будных днях у рэйс адпраўляецца 59 аўтобусаў, па выхадных — 65. Паслугамі транспарту ў летні перыяд карыстаецца ў звычайныя дні 400 чалавек, выхадныя — больш як 500. Зімой пасажырапаток крыху змяншаецца. Аўтавакзал абслугоўвае адзін міжабласны маршрут, пяць міжгародніх і шаснаццаць прыгарадных.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Республиканского дочернего унитарного предприятия по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт» (продавец имущества) извещает о проведении 17 января 2020 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

**Местонахождение:** Гомельская область, Гомельский р-н, г. Речица, на АЗС 1.
**Примечание:** имущество реализуется в соответствии с п.п. 2.3 ст. 93 НК РБ при условии выполнения п. 4.1. Указа Президента Республики Беларусь № 169 от 10.05.2019 «О порядке распоряжения государственным имуществом»

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Компрессор К-20 (инв. №4485_r).** Техническое состояние составных частей компрессора: двигатель, магнитные пускатели, головки компрессорные, трубопроводы с обратными клапанами находятся в технически исправном состоянии. В районе одной из 4 опор ресивера, объемом 500,0 л имеется трещина длиной около 2,5 см. Компрессорная установка К-20, (инв. № 4485_r) пригодна к эксплуатации при условии ремонта | **686,52** | **68,65** |

**Продавец:** РУП «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт», 247012, пос. Янтарный,12, Поколюбичский с/с. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (0232) 99-33-87 – Лариса Ивановна. **Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо:** 1) Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (РУП «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт»):** р/с: BY82 BLBB 3012 0490 3217 3000 1001 в ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 490321730, назначение платежа – задаток за участие в аукционе за лот № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). 2) Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 24 декабря 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 15 января 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником,** объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)». Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 23.10.2019 г. № 202 (29069). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении 27 января 2020 г. 93-го открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка в Солигорском районе**

| № лота | 1 |
|---|---|
| Предмет аукциона | Право заключения договора аренды земельного участка |
| Адрес земельного участка | **Минская обл., Солигорский р-н, Чижевичский с/с, п. Хвалево, ул. Центральная, 6Б** |
| Кадастровый номер | 625085411601000117 |
| Площадь, га | 0,1353 |
| Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение) | Размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома) |
| Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории* | Имеется подъезд с песчано-гравийным покрытием, возможность подключения к сетям электроснабжения, газоснабжения, связи |
| Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений | Земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей – 0,0048 га |
| Начальная цена продажи, руб. | 1 083,38 |
| Сумма задатка, руб. | 216,00 |
| Срок аренды земельного участка / условия продажи | 30 лет / см. пункт 6 |
| Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. | 2 463,29 + затраты на объявление в СМИ |

*в разделе указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.

Продавец: Солигорский районный исполнительный комитет (далее – райисполком), 223710, г. Солигорск, ул. Козлова, 35.
Порядок проведения аукциона и порядок оформления участия в торгах определяются Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.
1. **Аукцион состоится в 15.00 27 января 2020 г.** по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, зал заседаний райисполкома.
2. Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:
2.1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме; при подаче заявления представитель юридического лица должен иметь паспорт, доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по нотариально удостоверенной доверенности) – паспорт;
2.2. Копии устава, учредительных документов, свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов (для юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования (для индивидуальных предпринимателей), копию паспорта, выписку об открытии в филиале 633 АСБ «Беларусбанк» лицевого счета для возврата задатка (для физических лиц);
2.3. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет райисполкома (УНН 601061003) № BY75 AKBB 3641 0000 0429 7660 0000 в ЦБУ № 633 АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, с отметкой банка, не позднее срока окончания приема документов на участие в аукционе – 21 января 2020 г.;
2.4. Гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо заключает с райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по установленной форме.
3. По лоту осуществляется ежегодная уплата арендной платы согласно кадастровой стоимости земельного участка и его целевому назначению.
4. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельным участком и документацией. Осмотр земельного участка осуществляется претендентами на участие в аукционе самостоятельно либо в сопровождении специалиста управления землеустройства райисполкома в согласованное время (рабочие дни) в течение установленного срока приема документов.
5. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов максимальную цену.
6. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:**
подписать протокол аукциона в день проведения аукциона;
в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона (в счет оплаты засчитывается сумма внесенного задатка), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;
не позднее 2 рабочих дней после совершения оплаты заключить с Чижевичским сельским исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок, после его заключения, государственную регистрацию права на земельный участок;
в течение одного месяца со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок обратиться в райисполком для получения разрешительной документации на проектирование и строительство объекта;
обеспечить соблюдение требований градостроительного паспорта земельного участка при осуществлении проектирования и строительства;
в течение двух месяцев после получения разрешительной документации на проектирование и строительство объекта заключить договор подряда на выполнение проектных работ;
обеспечить разработку проектно-сметной документации в сроки, установленные Положением о порядке определения продолжительности разработки проектной документации на строительство зданий и сооружений, утвержденным приказом Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь от 16 февраля 2005 г. № 40;
согласовать и утвердить в установленном порядке разработанную проектно-сметную документацию в течение трех месяцев;
юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю не позднее 6 месяцев, а юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю не позднее 6 месяцев, а гражданину не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к освоению земельного участка;
осуществить строительство жилого дома в сроки, установленные законодательством;
возместить в установленном порядке затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к предоставленному земельному участку в соответствии с частью третьей подпункта 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».
**7. Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, кабинет 244, с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням со дня опубликования настоящего извещения и по 21 января 2020 г. включительно. Контактные телефоны: 8 (0174) 22 77 46, 22 55 23**

**ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел. (8 017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY.
Продавец: ОАО «Крупский плодоовощной завод» (УНП 600025392) в лице ликвидатора ООО «Партнер-Консультант», тел. +375 (17) 395-58-91.
Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **9 января 2020 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Емкость 7 $м^3$, инв. № 4290753 (б/у) | 420,00 |
| 2 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 4290754 (б/у) | 756,00 |
| 3 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 4290755 (б/у) | 756,00 |
| 4 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 4290756 (б/у) | 756,00 |
| 5 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 4290757 (б/у) | 756,00 |
| 6 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 450107 (б/у) | 756,00 |
| 7 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290780 (б/у) | 756,00 |
| 8 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290781 (б/у) | 756,00 |
| 9 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290782 (б/у) | 756,00 |
| 10 | Емкость 20 $м^3$, инв. № 4290758 (б/у) | 840,00 |
| 11 | Емкость 20 $м^3$, инв. № 4290759 (б/у) | 840,00 |
| 12 | Емкость 20 $м^3$, инв. № 4290760 (б/у) | 840,00 |
| 13 | Емкость 50 $м^3$, инв. № 4290752 (б/у) | 2016,00 |
| 14 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290761 (б/у) | 756,00 |
| 15 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290762 (б/у) | 756,00 |
| 16 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290763 (б/у) | 756,00 |
| 17 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290764 (б/у) | 756,00 |
| 18 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290765 (б/у) | 756,00 |
| 19 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290768 (б/у) | 756,00 |
| 20 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290769 (б/у) | 756,00 |
| 21 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290770 (б/у) | 756,00 |
| 22 | Бракиражная машина В6-ВИА, инв. № 450062 (б/у, н/раб) | 231,00 |
| 23 | Автомат для укупорки Л5-ВУВ, инв. № 450124 (б/у, н/раб) | 714,00 |
| 24 | Этикетировочный автомат Л5-ВЭ2М, инв. № 450064 (б/у, н/раб) | 966,00 |
| 25 | Вибробункер Л5-ВБК, инв. № 450074 (б/у, н/раб) | 121,80 |
| 26 | Устройство для переворачивания В6-ВИА, инв. № 450125 (б/у, н/раб) | 231,00 |
| 27 | Машина фасовочная Д9-ВРЕ6, инв. № 450076 (б/у, н/раб) | 1596,00 |
| 28 | Автомат наклеивания марок АНМК-4, инв. № 450065 (б/у, н/раб) | 588,00 |
| 29 | Водонагреватель, инв. № 450113 (б/у, н/раб) | 67,20 |
| 30 | Комплект транспортеров Б-2 (б/у, н/раб) | 1360,80 |
| 31 | Котел паровой Е-1,0-0,9Р-3 (Э), инв. № 430114 (б/у, н/раб) | 3822,00 |
| 32 | Разливочный аппарат (б/у, н/раб) | 714,00 |
| 33 | Котел паровой Е-1,0-0,9Р-3 (Э), инв. № 430116 (б/у, н/раб) | 3822,00 |
| 34 | Центрифуга (б/у, н/раб) | 50,40 |
| 35 | Машина моечная АММ 6, инв. № 450061 (б/у, н/раб) | 972,00 |
| 36 | Емкость 15$м^3$, инв. № 450108 (б/у) | 1512,00 |
| 37 | Емкость 25$м^3$, инв. № 4290783 (б/у) | 2184,00 |

Местонахождение – г. Крупки, тел. для ознакомления +37529 698-53-53.
**Для участия в торгах необходимо в срок с 25.12.2019 9.00 по 08.01.2020 17.00** 1) зарегистрироваться и подать заявку на участие в торгах по выбранному лоту на сайте **BELTORGI.BY**; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 03.08.2019, 12.11.2019.

**Информация о внесении изменений в извещение о проведении аукциона**

В извещении о проведении аукциона по продаже имущества Столбцовского филиала Минского областного потребительского общества, опубликованном в газете «Звязда» от 11.12.2019 на стр. 15, вносятся следующие изменения:

| | |
|---|---|
| Наименование объекта | **Помещение магазина «Детский мир»** |
| Адрес объекта | **г. Столбцы, ул. Ленинская, 91** |
| Общая пл., кв. м | **16** |
| Срок заключения договора аренды | 1 год |
| Начальная цена права заключения договора аренды | 540,80 |
| Сумма задатка | 54,08 бел. руб. |
| Размер ежемесячной арендной платы | 32 БАВ, коэффициент спроса 3 |
| Целевое использование имущества | Для осуществления розничной торговли цветами (живыми), компьютерной техникой, оптикой, зоотоварами, а также для оказания услуг по копированию и изготовлению документов, изготовлению товаров с нанесением на него определенного фото и рисунков |

УНП 600037767

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ**

**Организатор электронных торгов (продавец):** Инспекция Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Фрунзенскому району г. Минска № 2, 220015, г. Минск, пр-т Пушкина, 11, +375 17 395 37 32.
**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Торги проводятся 27.01.2020** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by. Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

| № лота | Наименование предмета торгов; его местонахождение | Краткая характеристика | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Легковой автомобиль «Samand TU5»; г. Минск, пр-т Пушкина, д. 11 | Легковой автомобиль «Samand TU5», год выпуска 2011, объем двигателя 1587 $см^3$, цвет – светло-серый металлик, тип кузова – седан, оцинкован, механика, переднеприводной, пробег – 104 218 км, бензин АИ-95 | 2059,60 | 205,96 |

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – 21.01.2020, до 15.00.
**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах рег. № ___ по заявлению № ___.
Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Сроки возмещение затрат на организацию и проведение торгов:**
Победитель (единственный участник) торгов в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах торгов обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, иные платежи, указанные в протоколе.
**Сроки и условия заключения договора:**
Срок подписания договора купли-продажи имущества – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат, иных платежей, указанных в протоколе о результатах торгов.

**ОБЪЯВЛЕНИЕ**
**о повторных торгах**

*Государственное предприятие «БелЮрОбеспечение» объявляет о проведении торгов:*
**Имущество принадлежащее ООО «Вивалия», находящееся: Столбцовский р-н, пос. Новоколосово.**
Лот № 5. 2020.01.00047: ТМ 400, начальной стоимостью 664,00 бел. руб.
Лот № 5. 2020.01.00048: Торцовый станок рольганг СТ-1, начальной стоимостью 62,40 бел. руб.
Торги будут проведены 16.01.2020 (9.00 – 18.00) на сайте e-auction.by.
Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 16.00 15.01.2020 г. на депозитный счет УПИ ГУЮ Миноблисполкома, р/с BY84AKBB36420000002880000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 600013502.
Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе аукционы.

УНП 192821149

03.01.2020 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:
1) О внесении изменений в устав.
Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность). Дата сбора реестра акционеров 23.12.2019 г.
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 24.12.2019 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.
Наблюдательный совет.

УНП 200050191

## Гурт «Стары Ольса»:

# «У Сургуце нас сустракалі каля трапа самалёта, як важных шышак!»

**Калі музыку параўноўваць з вытанчанымі напоямі, то гурт «Стары Ольса», які першы адкрыў для беларусаў нашу музычную спадчыну Сярэднявечча, цягне на ўсе сем зорачак. Ці жарт — калектыў існуе ўжо 20 гадоў, мае ў актыве 10 студыйных альбомаў, у тым ліку каверы сусветных хітоў у «медыявальным» гучанні, тры live-зборнікі, свежанькі сінгл і аўдыяспектакль паводле Караткевіча, і з часам не толькі не страчвае папулярнасці, а адкрывае ўсё новыя далягляды. З нагоды юбілею і перад традыцыйным Калядным фэстам 25 снежня, дзе будзе адзначацца 20-годдзе «Старога Ольсы», мы пагутарылі з удзельнікамі гурта — заснавальнікам, дударом і вакалістам Змітром САСНОЎСКІМ і флейтысткай ды менеджарам Марыяй ШАРЫЙ, даведаліся праўду і міфы, падлічылі рэкорды калектыву і крыху памарылі пра 2020-ы.**



### ЦІ ПРАЎДА, ШТО...

**...адно з першых выступленняў адбылося проста ў чыстым полі, на раскопках?**

**Зміцер:** Там былі не выступленні, у Полацкім археалагічным летніку адбывалася фарміраванне ідэі будучага гурта. Я прывёз з сабой калекцыю адрэстаўраваных музычных інструментаў і разам з іншымі музыкамі спрабавалі пайграць на іх разам у нефармальнай абстаноўцы, ладзілі нейкія танцы і ўсё такое. А першае выступленне, што сімвалічна, адбылося ў 1999 годзе на святце пісьменства пад помнікам Францыску Скарыну ў Полацку.

**... на канцэрты прыходзяць дзеці тых слухачоў, якія калісьці пазнаёміліся пад «Старога Ольсу»?**

**Марыя:** Дарэчы, бывае такое. Прыходзяць людзі рознага ўзросту: і зусім маленькія, каго бацькі прыносяць на руках, і школьнікі, і амаль дарослыя падлеткі — мне падаецца, што з часам наша дзіцячая аўдыторыя толькі расце. Гэта радуе.

**...першыя амерыканскія гастролі зладзіліся нечакана, бо ў краўдфандынгавай кампаніі на запіс альбома кавераў вы сабралі больш грошай, чым планавалі?**

**М.:** Мы не планавалі такі альбом запісваць, але папулярнасць кавераў (так, сыграны гуртам на старажытных інструментах хіт Metallica One мае на YouTube звыш 3,5 мільёна праглядаў! — **Аўт.**) падштурхнула да гэтай ідэі. І калі ўсяго за тыдзень сабралі грошы на альбом, замахнуліся на больш маштабную мэту — тур па Амерыцы, тым больш што запытаў і запрашэнняў было вельмі многа. Не скажу, што праз краўдфандынг мы пакрылі ўсе выдаткі і назбіралі шалёна грошай, але, відаць, на той момант усё склалася, і ўдалося рэалізаваць абедзве гэтыя мэты. Было больш за тысячу спонсараў з усяго свету, і ўсім мы потым дасылалі падарункі за падтрымку: Алесь Чумакоў рабіў гуслі, Зміцер шыў скураныя торбачкі, я запісвала пяром нотны зборнік — танцы з «Полацкага сшытка», ткала ўручную на дошчачках пасы... Амаль чатыры гады прайшло, а праект яшчэ дагэтуль адгукаецца вітаннямі.



**З.:** Мы доўга не ездзілі на іншыя кантыненты, акрамя Еўропы. Аднак нямала слухачоў з розных краін цікавіліся, калі мы да іх прыедзем, і з Амерыкі таксама. Ну мы і сказалі: падтрымайце наш альбом, тады прыедзем — і яны падтрымалі! І не толькі ЗША, але і Аўстралія, і чамусьці вельмі актыўна Бразілія...

**...па выніках амерыканскіх вандровак Зміцер піша кнігу?**

**З.:** Няпраўда. У Амерыцы вольны час я выкарыстоўваў для таго, каб напісаць гістарычны раман пра князя Вітаўта, а з самой вандроўкі мы вялі дзённік — прынамсі з першага туру, калі ўсё было нязвыклым і цікавым.

### А ПОНІ СЛУХАЕ ДЫ ТАНЧЫЦЬ

***— Калі згадаць самы памятны кліп, то...***

**З.:** Кожны нечым памятны. Напрыклад, для «Літвіна» вядомы дзеяч рыцарскага руху Фёдар Міхееў сабраў 92 чалавекі. А «Князя Вітаўта» мы здымалі ў Польшчы — каля вогнішча, з коньмі, у цалкам сюррэалістычнай атмасферы. І, канешне, першы кліп запомніўся — «У карчме» *(смяецца)*. Там усё было цудоўна — і пажар, і падсмажаны да чарнаты кабанчык, і зламаная электрастанцыя, і стэарын, які выбухнуў у самы нечаканы момант, і адсырэлы порах, і пабіты посуд, і мая паламаная ключыца — і ўсё гэта за адну ноч.

**М.:** У нас даўно не выходзіла новых кліпаў, але... Рыхтуем сюрпрыз — у наступным годзе будзем здымаць, тым больш, песня добрая ёсць. Не хочацца паўтарацца ў тэмах і стылістыцы, таму плануем штосьці зусім новае для сябе.

**З.:** Рэч у тым, што ў нас вельмі многа канцэртных відэа, якія прадстаўляюць творчасць гурта, таму пастановачных кліпаў сапраўды доўга не здымалі, гадоў мо, восем ці дзесяць. А цяпер вырашылі сітуацыю выпраўляць, і да канца 2020 года абяцаем новы, незвычайны ролік — сцэнарый наш, нафантазіравалі яго па дарозе з гастроляў, а здымаць будзе рэжысёр з Нью-Ёрка.

***— Ведаю пра выпадак, які варта было б прыдумаць, калі б яго не было — у Сургуце расійскі федэральны чыноўнік прыйшоў на канцэрт і расказаў, што ён зямляк Змітра...***

**З.:** Нават не зямляк — сваяк! Прычым гэта быў чыноўнік даволі высокага рангу, адзін з арганізатараў канцэрта. Цэлую ноч потым з ім згадвалі агульных родзічаў... Але ў Сургуце была весялейшая гісторыя, як да трапа самалёта, на якім мы ляцелі, пад'ехаў картэж машын. Гэта наогул забаронена, акрамя ўрадавых дэлегацый. Мы думалі: вось, нейкае начальства з намі ляціць, альбо гэта гурт «Мумій Троль» так сустракаюць. Але іхні гітарыст праходзіў міма, таксама здзівіўся, якую гэта «шышку» сустракаюць. Выходзім на трап — а там нашы, беларусы, крычаць: «Стары Ольса!»

**М.:** У нас зусім розная публіка, як па ўзросце, так і па статусе. У Гомелі на канцэрт да нас прыйшоў прафесар, які выкладаў у Змітра ва ўніверсітэце філасофію, і прывёў з сабой яшчэ некалькіх выкладчыкаў. Тады нарадзіўся жарт: «Раней я слухаў іхнія лекцыі, а цяпер яны — маю».

**З.:** Сапраўды, вельмі прыемная была сустрэча. Ён сказаў, што гэта вельмі цікавае спалучэнне: пачуць аповед пра пэўныя гістарычныя падзеі, і тут жа музычнае суправаджэнне таго часу. Ці запрасіў пачытаць лекцыі? Ужо гады тры як запрашаюць, але ўсё неяк не атрымліваецца.

***— У вашай скарбонцы дзве «Рок-кароны», прэмія Experty.by, нават Нацыянальная музычная прэмія, пакуль яна яшчэ існавала. Якая ўзнагарода самая дарагая?***

**М.:** Стаяць статуэткі і стаяць. Усе гэтыя конкурсы, лічу, усё ж суб'ектыўная думка канкрэтных людзей, якія склалі плэй-лісты, сфарміравалі журы і выбралі найлепшых па нейкіх крытэрыях... Для мяне большая каштоўнасць — бачыць людзей на канцэртах, лавіць іхнюю шчырую рэакцыю, чытаць каментарыі, гугліць водгукі пасля канцэртаў. Калі да цябе выходзіць чалавек са слязьмі на вачах, цалуе і абдымае, гэта дарагога варта.

...А аднойчы на канцэрце ў Лошыцкім парку, згадваюць музыкі, прыйшоў чалавек і сказаў без пафасу: «Я наркаман са стажам, і ваша музыка выратавала мне жыццё — дзякуй вам!»

**М.:** Чаго толькі не было! З жывёламі часта прыходзілі. Вось, мабыць, самы незвычайны наш слухач — у апошнім туры па ЗША выступалі мы ў Індыяне на фэсце, і там была гаспадыня з гожым поні. Яму так спадабалася наша музыка, што кожнае выступленне (а мы гралі пяць разоў на дзень) у вальеры прытупваў і ішоў як мага бліжэй у бок сцэны. А калі мы ўжо вярнуліся дадому, жанчына напісала, што хоча набыць некалькі дыскаў, бо поні без нашай музыкі сумуе.

**З.:** Можа, ён у мінулым жыцці быў музыкам і граў на дудзе? Альбо рыцарскім канём, і гэта генная памяць узыграла...

***— Працягваючы тэму незвычайнага — якія самыя дзіўныя падарункі рабілі прыхільнікі?***

**З.:** Напрыклад, у штаце Арэгон нам падарылі адпачынак у доме над абрывам, проста над Ціхім акіянам — гэта лічыцца?

**М.:** Наогул часта робяць прыемныя падарункі — мне, напрыклад, дораць завушніцы, ці ведаючы гэтую маю слабасць, ці проста ўгадваюць. Ёсць пара з Навапалацка, якая ездзіць на кожны наш канцэрт па ўсіх рэгіёнах, а на знакавыя даты рыхтуе нейкі пачастунак — зараз на 20-годдзе гэта быў вялікі юбілейны торт. Яны маюць спецыяльны альбом, дзе пасля кожнага выступлення з'яўляюцца новыя здымкі з пазнакамі, дзе і калі тое было. Яшчэ часам прыносяць музычныя інструменты — летась на адным з фэстаў падарылі



турэцкую флейту, а сёлета адзін з фанатаў у Амерыцы прэзентаваў нацыянальную, індзейскую флейту.

***— Наогул, у вас вялізная калекцыя інструментаў — які з іх самы рэдкі?***

**З.:** У сэнсе старасці ці распаўсюджанасці? Калі другое, то рэбек, мабыць, яшчэ ліра, гуслі. Дуда ўжо зараз, дзякаваць Богу, не рэдкасць.

***— Адна з самых цікавых вашых работ — аўдыяспектакль «Ладдзя роспачы» паводле Уладзіміра Караткевіча. Ці няма ідэі «начытаць» яшчэ кагосьці з класікаў?***

**З.:** У беларускай літаратуры існуе самы вялікі ў свеце варыянт легенды пра Трыстана і Ізольду XV стагоддзя. І наступны наш тэатральны эксперымент палягае ў тым, што плануем адрадзіць батлеечную пастаноўку легенды. Музыкі «Старога Ольсы» будуць граць і, магчыма, выступяць у якасці акцёраў, самі ж мы будзем кіраваць лялькамі і падзеямі на сцэне — я лічу, гэта ўнікальнае спалучэнне музыкі, старадаўняй тэатральнай традыцыі і нетрадыцыйнага для батлейкі свецкага, тым больш лірычнага, твора. Хочам за зіму падрыхтаваць спектакль і на вясновыя дзіцячыя канікулы паказаць яго ў Мінску як мага больш шырокай публіцы — дзецям і дарослым.

**М.:** Цікава тое, што падзеі XII стагоддзя, запісаныя ў XV, шафа і стыль лялек XVII стагоддзя, а выконваць будуць акцёры стагоддзя XXI-га — такое атрымліваецца наслаенне стагоддзяў, якое, спадзяюся, будзе цікавае і для гледачоў.

### ДОМА БЫВАЦЬ ЧАСЦЕЙ

***— Паколькі справа ідзе да Новага года, прапаную агучыць некалькі мараў і планаў — мо, спраўдзяцца?***

**З.:** Мы за апошнія тры-чатыры гады, знаходзячыся ў Амерыцы, заўважылі, што пачалі губляць сувязі з Еўропай. І таму наступны год будзе рэстаўрацыяй нашых канцэртных тураў па еўрапейскіх краінах — Польшчы, Чэхіі, Германіі, Італіі і гэтак далей, ну і, канешне, у Беларусі мы будзем значна часцей.

**М.:** Мне хочацца выступіць там, дзе мы яшчэ не былі, у новых гарадах і краінах.

***— Можа, і ў бок Азіі пазіраеце?***

**З.:** Гэта цікава, ёсць адтуль прапановы, і літаральна днямі адгукнуўся зноў арганізатар канцэртаў у Кітаі. Але перамовы ідуць ужо гадоў дзесяць, і мы не можам прыйсці да агульнай думкі, бо яны прапаноўваюць невыканальныя кантракты ў сэнсе часу — для іх мінімальны час, каб акупіць аргвыдаткі і зарабіць нешта, складае паўгода, а насамрэч, мы атрымліваем прапановы ад двух да пяці гадоў. А як перайначыць усё сваё жыццё, каб там жыць і працаваць, а дадому толькі лятаць час ад часу? Мы не згодныя, тым больш, апошнія тры гады амерыканскіх гастроляў вельмі цяжка даліся, мы шмат не жылі дома і хацелася б нарэшце пабыць з роднымі. Таму кітайскія кантракты на гэты момант адмаўляем.

**М.:** Мяркую, калі б гэта было напачатку дзейнасці гурта, то паехалі б яшчэ як. А цяпер, калі ўсе абраслі дзецьмі, дамамі, работамі, корчмамі — як гэта ўсё ламаць? Тут і два месяцы гастроляў цяжкія, а пра два гады і размовы няма.

**З.:** Былі перамовы з Арменіяй і Казахстанам. Не ведаю, што іх цікавіць у нашай музыцы, і пакуль канкрэтыкі тут няма. Таму ў планах перадусім вяртанне дамоў і ў Еўропу.

...«Ствараць музыку не так ужо складана; закрэсліваць лішнія ноты — вось што цяжэй за ўсё», — сказаў некалі знакаміты кампазітар Іаганес Брамс. Мы са «Старым Ольсам» таксама паспрабавалі абысціся без філасофскіх развагаў, каб пакінуць, што называецца, самы сок. Наколькі ўдалося — меркаваць вам.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота аўтара і з архіва гурта.**

*Цалкам тэкст інтэрв'ю, больш фота і відэа глядзіце на сайце www.zviazda.by.*

## Гасцёўня

## А вы ведалі?

### Якое спалучэнне колеру вачэй і валасоў самае рэдкае ў свеце?



Кожны чалавек прыгожы і ўнікальны па-свойму, але ёсць спалучэнне колеру вачэй і валасоў, якое сустракаецца радзей за ўсё. Гэта рудыя валасы і блакітныя вочы. Успомніце, ці ёсць у вас такі знаёмы? Калі так, то ён адносіцца да вельмі рэдкай пароды, бо і ген блакітных вачэй, і ген рудых валасоў з'яўляюцца рэцэсіўнымі. Рудавалосых усяго 1-2 % насельніцтва зямнога шара, а блакітныя вочы сустракаюцца ў 17 %, што азначае, што толькі 0,17 % насельніцтва і рыжыя, і блакітнавокія адначасова.

### Аўтабан — гэта не тое, што ўсе думаюць

Аўтабан першапачаткова — гэта не хуткасная траса: «аўтабанам» (ням. Bundesautobahn) завецца ўся федэральная сістэма аўтамабільных дарог Германіі працягласцю 13 000 кіламетраў. Прыблізна 25—30 % аўтамагістраляў аўтабана (каля 3500 кіламетраў) сапраўды не маюць хуткасных абмежаванняў. Затое там існуе найстражэйшая забарона на ўсе віды дзеянняў, якія адцягваюць кіроўцу ад кіравання аўтамабілем: размовы па мабільным тэлефоне, яда за рулём і г. д., і штрафы за парушэнне гэтай забароны вельмі вялікія.

### Чаму дыета несумяшчальная з алкаголем?

Алкагольныя напоі перашкаджаюць вам пахудзець. Рэч нават не столькі ў тым, што алкаголь павышае апетыт і зніжае самакантроль (а так яно і ёсць), колькі ў тым, што мозг, выявіўшы ў крыві прысутнасць этылавага спірту, спыняе метабалізм, у тым ліку працэс ператварэння тлушчу ў глюкозу, і канцэнтруецца на тым, каб як мага хутчэй вывесці з арганізма алкаголь і яго таксічныя вытворныя. Паколькі ваша цела здольнае засвойваць сама болей 15—30 мілілітраў чыстага спірту ў гадзіну, то працэс засваення бляшанкі піва, напрыклад, спыніць спальванне тлушчу прыкладна на гадзіну-паўтары, і кожная новая бляшанка будзе дадаваць да гэтага часу яшчэ каля паўгадзіны.

### Якое прозвішча было ў Леанарда да Вінчы?

Здаецца, што адказ на гэтае пытанне ўжо заключаны ў самім пытанні, але гэта не так. Да Вінчы — гэта не прозвішча, а ўказанне на той факт, што Леанарда паходзіў з мястэчка Вінчы. Чытаць гэта трэба так: Леанарда з Вінчы.

А якое ж было прозвішча італьянскага генія? Верагодна, ніякае: бацька Леанарда, натарыус на імя П'еро, не мог ажаніцца са сваёй каханай, простай сялянкай Катарынай. Неўзабаве пасля нараджэння хлопчыка яго бацька ўзяў шлюб з дзяўчынай шляхетнага і багатага роду, а праз тры гады забраў маленькага Леанарда пад сваю апеку і клапаціўся пра яго як пра законнага сына.

Даты | Падзеі | Людзі

**24 СНЕЖНЯ**

У краіне

**1784** год — нарадзіўся Зарыян Якаўлевіч Даленга-Хадакоўскі, славяназнавец, адзін з заснавальнікаў беларускай, рускай, польскай і ўкраінскай археалогіі, фалькларыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі. Член Пецярбургскага Вольнага таварыства аматараў расійскай славеснасці, маскоўскага Таварыства гісторыі і старажытнасцяў расійскіх. Працаваў у Мінску прыватным адвакатам, вывучаў старажытныя беларускія акты і граматы. Даследаваў гарадзішчы ў Полацку, Віцебску, Тураве, каля Брэста, Гомеля, Магілёва. Рабіў запісы фальклору, мясцовых дыялектаў, абрадаў. Склаў рэестр агульнаславянскіх тапонімаў, у тым ліку беларускіх, вызначыў тэрыторыі пашырэння беларускай мовы. Памёр у 1825 годзе.

**1874** год — нарадзіўся епіскап Магілёўскі і Мінскі Іасаф (Жэвахаў). Навамучанік зямлі Беларускай. У снежні 1937 года расстраляны.

**1904** год — нарадзіўся Алесь Дудар (сапр. Аляксандр Аляксандравіч Дайлідовіч), беларускі паэт, крытык, перакладчык. Працаваў у газетах «Савецкая Беларусь», «Полацкі пралетар». Адзін з ініцыятараў стварэння літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Аўтар зборнікаў «Сонечнымі сцежкамі», «Беларусь бунтарская», «Марсельеза». У 1936 годзе рэпрэсіраваны, у 1937-м расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957 годзе.

**2004** год — у МЗС адбылося падпісанне Пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Рэспублікі Малдова аб узаемных бязвізавых паездках грамадзян.

У свеце

**1814** год — Генцкі мірны дагавор паклаў канец англа-амерыканскай вайне, якая пачалася ў 1812-м. Узброены канфлікт паміж ЗША і Вялікабрытаніяй адбыўся ў перыяд напалеонаўскіх войнаў. Атрымаў у амерыканцаў назву «другой вайны за незалежнасць», паколькі пацвердзіў статус ЗША як суверэннай дзяржавы. У канфлікт на баку Вялікабрытаніі былі ўцягнутыя шматлікія плямёны індзейцаў.

**1909** год — нарадзіўся Адам Рапацкі, польскі дзяржаўны і грамадскі дзеяч, дыпламат, аўтар плана стварэння безатамнай зоны ў Цэнтральнай Еўропе. Памёр у 1970 годзе.

**1924** год — нарадзіўся Віктар Іванавіч Балашоў, расійскі тэле- і радыёдыктар, народны артыст Расійскай Федэрацыі.

**1979** год — міністр абароны СССР Дзмітрый Усцінаў падпісаў дырэктыву, у якой гаварылася: «Прынята рашэнне аб уводзе некаторых кантынгентаў савецкіх войскаў, дыслакаваных у паўднёвых раёнах нашай краіны, на тэрыторыю ДРА ў мэтах аказання дапамогі дружалюбнаму афганскаму народу, а таксама стварэння спрыяльных умоў для прадухілення магчымых антыафганскіх акцый з боку сумежных дзяржаў». Назаўтра раніцай першым на тэрыторыю ДРА быў перапраўлены 781-ы асобны разведвальны батальён 108-й мотастралковай дывізіі. Следам за ім пераправіўся чацвёрты дэсантна-штурмавы батальён 56-й брыгады. У той жа дзень пачалася перакідка часцей 103-й гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі на аэрадромы Кабула і Баграма.



**У сувязі са святам наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе 27 снежня 2019 года.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 9.27 | 16.50 | 7.23 |
| Віцебск | 9.25 | 16.32 | 7.07 |
| Магілёў | 9.18 | 16.40 | 7.22 |
| Гомель | 9.05 | 16.46 | 7.41 |
| Гродна | 9.41 | 17.07 | 7.26 |
| Брэст | 9.33 | 17.17 | 7.44 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 19 снежня. Месяц у сузор'і Стральца.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Данілы, Івана, Лукі.*
***К.*** *Евы, Ірмы, Эвеліны, Адама, Рыгора.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Максім Галкін — як бурштынавыя каралі. Таксама вісіць на шыі ў пенсіянеркі.**

— Дарагі, а што мы будзем рабіць на доўгіх навагодніх выхадных?
— Да мамы тваёй цябе адвязу.
— А калі яны скончацца?
— Тады прыеду і забяру.

**Не ўсе ведаюць: калі нарвежскія лыжнікі сыходзяць у адпачынак, яны цалкам выздараўліваюць.**

— Якая на Дзіму прыгожая кашуля.
— Ды не, гэта так здаецца на кантрасце з самім Дзімам.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 4275.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 23 снежня 2019 года.